Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

20 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. СУБОТА

№ 119 (29233)

ЗВЯЗДА

АДКАЗНАЯ МІСІЯ, ВЫСАКАРОДНАЯ ПРАФЕСІЯ

Заўтра медыкі Беларусі адзначаюць сваё прафесійнае свята. З Днём медыцынскіх работнікаў іх павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

«Вы выбралі для сябе адну з найважнейшых і самых высакародных прафесій на зямлі. Ваша адказная місія — захаваць чалавеку здароўе, а часам і жыццё. Да ўрачоў, якія дапамагаюць людзям пераадолець беды і нягоды, ва ўсе часы ставіліся з бязмежнай павагай», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сёння свет праходзіць чарговы стрэс-тэст: змагаецца з пандэміяй каранавіруснай інфекцыі. «На шчасце, у Беларусі выбудавана сістэма аховы здароўя з моцнай эпідэміялагічнай службай, сучаснымі навукова-практычнымі цэнтрамі, абсталяванымі клінікамі, уласнай фармацэўтычнай вытворчасцю і, самае галоўнае, дастатковай колькасцю практыкуючых медыкаў. Менавіта вашы самаадданая праца, вернасць абавязку, высокая кваліфікацыя і кампетэнтнасць дазваляюць забяспечыць даступнай і якаснай медыцынскай дапамогай усё насельніцтва рэспублікі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што эпідэмія яшчэ не завяршылася, але разам з тым ён перакананы, што дзякуючы прафесіяналізму людзей у белых халатах Беларусь пераможа ў гэтай барацьбе.

Жывi i квітней, Беларусь! Здароўе. Практычны падыход

«ПРАВЯЛІ КЛЕТАЧНУЮ ТЭРАПІЮ — І ПАЦЫЕНТ ПАЧАЎ РАЗМАЎЛЯЦЬ І ХАДЗІЦЬ»

Як беларускія неўролагі выратоўваюць жыцці ў самых няпростых выпадках

Маладому пацыенту з ЗША, які ў выніку інсульту меў параліч канечнасцяў і не мог размаўляць, беларускія нейрахірургі правялі лячэнне ствалавымі клеткамі. З Мінска мужчына ад'язджаў, размаўляючы цэлымі фразамі, і мог самастойна рухацца. Як навыкі беларускіх нейрахірургаў дапамагаюць выратоўваць жыцці ў самых няпростых выпадках, «Звяздзе» расказаў напярэдадні Дня медыцынскага работніка вядомы нейрахірург, намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Юрый ШАНЬКО.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Масквічы з інстытута імя Бурдэнкі былі ўражаны»

Летась беларуская нейрахірургія адзначыла свой 70-гадовы юбілей.

— Развіваць яе пачынаў славуты неўролаг, акадэмік Мікалай Грашчанкоў, які ў пасляваенны час прыбыў у нашу краіну і ўзначаліў Прэзідыум НАН Беларусі. З яго ініцыятывы было створана першае нейрахірургічнае аддзяленне, у якое ў хуткім часе прыйшоў працаваць дацэнт Яфрэм Злотнік. Менавіта ён стаў заснавальнікам мікранейрахірургіі ў Савецкім Саюзе. У яго вучыліся многія, у тым ліку выдатны расійскі нейрахірург Аляксандр Канавалаў. У Беларусі першымі пачалі развіваць сасудзістую дыягностыку — ангіяграфію і хірургію анеўрызмаў артэрыяльных і артэрыявянозных мальфармацый — яшчэ ў тыя гады, калі многія лічылі, што з'яўленне анеўрызмаў сасудаў галаўнога мозга абумоўлена сіфілісам, — пачынае са знакавых гістарычных вех прафесар Шанько.

СТАР. 6

75 мірных гадоў Беларусь ПАМЯТАЕ!

Маёру Гаўрылаву і іншым героям крэпасці

22 чэрвеня ў Брэсцкай крэпасці адкрываецца новая экспазіцыя, прысвечаная абаронцам Усходняга форта

Усходні форт — асаблівая старонка ў гісторыі абароны крэпасці. Гэты рубеж стаў апошняй апорай яе абаронцаў. Пасля вераломнага нападзення на крэпасць тут знайшлі ўкрыццё каля 400 чалавек. Іх згуртаваў у тры роты і ўзначаліў легендарны маёр Гаўрылаў. Кожнай роце быў адведзены ўчастак абароны, паміж імі ўстаноўлена тэлефонная сувязь... Як развіваліся далей падзеі, раскажуць экскурсаводы і шматлікія матэрыялы экспазіцыі.

Ад бастыёна да форта

Канцэпцыя экспазіцыі, а пасутнасці яшчэ аднаго музея на тэрыторыі Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» выспявала на працягу дзесяцігоддзяў. Назапашваліся ўспаміны ветэранаў, архіўныя звесткі, даследаванні навукоўцаў. І месца для яго было вызначана загадзя — Усходні форт. Вось толькі правесці рамонт, рэстаўрацыйныя работы ўдалося нядаўна, у асноўным дзякуючы сродкам, якія выдзелены з бюджэту Саюзнай дзяржавы. Яшчэ вясной тут вяліся работы па добраўпарадкаванні. На рэспубліканскім суботніку прадстаўнікі абласнога і гарадскога выканкамаў пасадзілі тут ліпавую алею. Зараз тэрыторыя і сам музей цалкам

гатовыя прымаць першых наведвальнікаў.

Пры гэтым ёсць магчымасць паглядзець не толькі экспазіцыю, але і сам Усходні форт, які складаецца амаль з сотні памяшканняў. Дарэчы, толькі дзясятая частка з іх, прыкладна 420 квадратных метраў, адведзена пад музейныя пакоі. Працягласць экскурсіі складае паўтары гадзіны. Яе маршрут праходзіць не толькі ўнутры форта, але і звонку, прадугледжаны час на агляд мемарыяльнай зоны.

Адна з залаў экспазіцыі прысвечаная гісторыі Усходняга форта. На ўваходзе наведвальнікі адразу заўважаць чырвоную цэглу, якая сама з'яўляецца гістарычнай каштоўнасцю. На цаглінах можна разгледзець даты вытворчасці, тады было прынята іх наносіць, — з 1864 да 1869-га. Яшчэ падчас прэзентацыі канцэпцыі новага праекта **намеснік дырэктара па навуковай рабоце мемарыяльнага комплексу Ларыса БІБІК** назвала Усходні форт вельмі каштоўным у сэнсе вывучэння ўмацаванняў XIX стагоддзя: «Хуткае развіццё наразной артылерыі прадыктавала патрэбу будаваць, мадэрнізаваць і ўмацоўваць падобныя збудаванні. У гэтым сэнсе форт — ключык да таго, што Брэсцкая крэпасць з бастыённага тыпу была пераўтвораная ў фортавую».

СТАР. 2

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Для мяне няма большай каштоўнасці, чым Беларусь, суверэнная і незалежная»

На нарадзе ў Прэзідэнта абмяркоўвалі, якія банкаўскія меры дапамогуць вывесці эканоміку з крызісу і ў будучым годзе расці сярэднесусветнымі тэмпамі

Для ўчарашняга мерапрыемства ў Палацы Незалежнасці не было надзвычайнай нагоды. Нарада аб мерах падтрымкі рэальнага сектара эканомікі з боку банкаўскай сістэмы — планавая, яна была ўнесена ў графік кіраўніка краіны адразу ж пасля фарміравання новага складу ўрада. Пры яго прызначэнні Прэзідэнт Беларусі паставіў задачу — не проста не дапусціць падзення нашай эканомікі ў гэтым годзе, а «выхапіць» кожны шанц для руху наперад. Першапачаткова на мерапрыемства запрасілі кіраўніка Нацбанка Паўла Калаура, прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанку, намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыя Крутога, памочніка Прэзідэнта Валерыя Бельскага і старшыню КДК Івана Тэртэля. У апошні момант склад удзельнікаў быў пашыраны, у тым ліку прадстаўнікамі рэгіёнаў і віцэ-прэм'ерамі. Але пачаў сустрэчу кіраўнік краіны з пытанняў палітычных.

Фота БелТА.

МОМАНТ ІСЦІНЫ

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ўважліва сочыць за сітуацыяй у краіне, сустракаецца з актывам у рэгіёнах, працоўнымі калектывамі. «Што датычыцца Мінска, Мінскай вобласці, тут кіраўніцтва прысутнічае, мы яшчэ сустрэнемся на ўзроўні актываў вашых рэгіёнаў і пагаворым, што адбываецца ў краіне, — анансаваў ён. — Ды вы і самі людзі адукаваныя, бачыце, што сёння фокус усіх палітычных інтарэсаў сканцэнтраваны на Беларусі, як з Захаду, так і з Усходу».

Прэзідэнт дадаў, што цягам апошніх сутак актывізаваліся пэўныя сілы, якія пачынаюць інтэнсіўна разгойдваць сітуацыю ў краіне.

Гэта, па яго словах, ведалі даўно і паспелі зрабіць некалькі крокаў на апярэджанне — сарваць планы маштабнай дэстабілізацыі Беларусі і давядзення краіны да стану «майдана».

«Такая была мэта. Таму ***маскі сарваны з пэўных лялек, якія былі ў нас тут, і лялькаводаў, якія сядзяць за межамі Беларусі»,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў пра вялікія і малыя каруселі збору подпісаў, калі адны і тыя ж людзі падпісваліся за ўсіх кандыдатаў. Да каруселі з людзей, па словах Прэзідэнта, дадаліся аўтамабілі, якія кружылі вакол аднаго квартала і сігналілі насупраць будынка КДБ.

«Мы гэта ўсё бачым і разумеем. ***Разумеем, што адбываецца, і ведаем гэтыя тэхналогіі.*** Відаць, што тут неканструктыўную пазіцыю занялі прадстаўнікі асобных СМІ, і прычым заходніх. Ігар Пятровіч (Сергеенка, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — **«Зв.»**), на гэта трэба жалезна рэагаваць, не трэба тут нікога баяцца. Вы як ніхто бачыце, што на коне нават не стабільная Беларусь — чысценькая і ўтульная. На коне — незалежнасць краіны. Проста жадаюць зламаць краіну», — заявіў беларускі лідар.

Ён заявіў, што не трэба яго ставіць перад выбарам. «Калі я павяду сябе дэмакратычна і пакажу, што я беленькі і пушысты, — у мяне шанц страціць краіну ўвогуле. І я тады буду праклятыя цягам года. ***Ніхто мне і ўсім нам, зразумела, не даруе знішчэння Беларусі»,*** — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

На сутнасці выбару Аляксандр Лукашэнка спыніўся асобна: «Мяне проста штурхаюць да таго, каб Лукашэнка пайшоў на нейкае сілавое вырашэнне гэтай сітуацыі. Вы ведаеце, вось такі выбар. Але вы павінны ведаць, што ***я ні ў якім выпадку — ні па сваіх функцыянальных абавязках (як Прэзідэнт па Канстытуцыі), ні проста як чалавек, які паклаў усё сваё жыццё на стварэнне гэтай незалежнай, суверэннай дзяржавы, — нікому не дазволю зламаць гэту краіну.*** Я хачу, каб мяне разумелі вы і іншыя — для мяне няма большай каштоўнасці, чым Беларусь, суверэнная і незалежная, і на захаванне гэтай краіны я пайду, чаго б мне гэта ні каштавала».

Прэзідэнт папрасіў і папярэдзіў людзей, якія дэстабілізуюць сітуацыю, не рабіць гэтага і не прымушаць улады ісці на пэўныя меры рэагавання. Ён таксама звярнуўся да бацькоў, бо частка актыўных удзельнікаў вулічных акцый — падлеткі, якія не памятаюць Беларусі сярэдзіны 1990-х: ***«Паглядзіце, калі ласка, за сваімі дзецьмі. Растлумачце ім, што парушаць закон не дазволена.*** Я не хачу, каб яны трапілі ў нейкую складаную сітуацыю».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што не варта рабіць герояў з махляроў.

ДЗЯЛІЦЬ НЕ ТРЭБА — УСЮДЫ НАШЫ ЛЮДЗІ

Тэма, з якой пачалася нарада, мае дачыненне і да эканомікі, лічыць Прэзідэнт.

«Хачу, каб вы разумелі, што я сказаў, і што ***сёння пытанне стаіць шырэй і глыбей — захаванне як мінімум дзяржаўнасці і незалежнасці нашай Беларусі,*** гэтай незалежнасці і дзяржаўнасці, якая звалілася нам на галаву без войнаў і крыві, як гэта было ў іншых», — сказаў ён і паўтарыў, што галоўная праблема сёння — не «каруселі» і жывыя ланцугі на вуліцах.

Свет пачынае адкрывацца пасля пандэміі, але ізаляцыя не дапамагла, і пачынаюцца размовы пра другую хвалю каранавіруса.

«Дзе гарантыя, што мы зноў не трапім у гэтую хвалю? ***Такой гарантыі няма, таму нам трэба сабрацца і жыць ва ўмовах, у якіх знаходзімся.*** Калі Нацбанк і пэўныя члены ўрада гэтага не разумеюць — значыць, рыхтуйцеся на выхад. Іншага не дадзена. ***Трэба сканцэнтравацца, усе рэсурсы аб'яднаць, па-першае, каб дапамагчы людзям»,*** — заявіў кіраўнік краіны.

Ён зноў абурыўся тым, што некаторыя работадаўцы знаходзяць грошы на ўласны адпачынак за межамі краіны, але не на выплату заробкаў работнікам.

Прэзідэнт загадаў дапамагчы прадпрыемствам, дакладна вызначыўшы пры гэтым, хто мае такую патрэбу. Яе не павінны атрымаць тыя, хто склаў рукі ці працуе на склад.

«Нам гэта не трэба. У нас сёння ёсць шмат «жывых» кантрактаў. І ў прыватных кампаній, і ў дзяржаўных. Тут дзяліць не трэба — усюды людзі. Але ім трэба крыху дапамагчы, падштурхнуць, — упэўнены лідар краіны. — Чаму такі «жывы» кантракт, па якім можна заўтра паставіць 10-20-100 машын, чаму яго не пракрэдытаваць, калі мы бачым, што заўтра ён верне грошы?»

Сітуацыя ў эканоміцы сапраўды незвычайная, пагадзіўся Аляксандр Лукашэнка, але трэба прымаць адпаведныя меры. Асабліва кіраўніка дзяржавы хвалююць функцыянаванне прадпрыемстваў — буйных, сістэмных арганізацый, у якіх вялікая колькасць занятых і якія пацярпелі з-за каранавіруса, — і іх крэдытная падтрымка з боку банкаў. Тут у фокусе пытанні: што з экспарцёрамі, як ідзе выкананне абавязацельстваў і работа з валютнай выручкай?

«У сакавіку, красавіку і маі былі асобныя скаргі прадпрыемстваў, што банкі зніжаюць ліміты перакрэдытавання (гасіцца крэдыт, але нельга атрымаць зноў хоць бы тую ж суму). Павел Уладзіміравіч (Калаур. — **«Зв.»**), я не ведаю, як там ідуць справы, але бачу па гэтых буржуях у Белгазпрамбанку. Мільёны, сотні мільёнаў — вы гэтага, мабыць, не бачылі — выводзілі за межы краіны. І ніхто цяпер не можа растлумачыць, хто, куды і навошта выводзіў. Куды, мы разабраліся з дапамогай людзей у пагонах. На жаль, вы гэтага не бачылі», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да старшыні Нацбанка.

Прэзідэнт працягнуў пералік праблем у банкаўскай сістэме. Сярод іх — пагаршэнне ўмоў па новых пазыках: прад'яўляюць залішнія патрабаванні, не ідуць насустрач па рэструктурызацыі старых даўгоў, хоць бы ў якасці часовай перадышкі да канца года, баяцца за свае немалыя бонусы і прэміі.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз папярэдзіў банкі аб неабходнасці забыцца пра бонусы: «Я не пра вас асабіста. А пра камерцыйныя банкі, якія даручыў узяць пад кантроль і фактычна іх падпарадкаваў вам. ***Ніякіх бонусаў, ніякіх прэмій! Там бедных няма. Гэта датычыцца асабліва гэтага года».***

Па просьбе старога ўрада Прэзідэнт пагадзіўся з павелічэннем ліміту гарантый бюджэту — 500 мільёнаў рублёў гарантыі ўрада і 700 мільёнаў рублёў гарантыі мясцовых органаў улады, па 100 мільёнаў рублёў на кожны рэгіён. Кіраўнік краіны пацікавіўся, як ідзе выбарка гэтых дадатковых рэсурсаў, колькі прадпрыемстваў іх ужо атрымалі і на якія мэты.

«У першую чаргу сродкі павінны ісці на падтрымку занятасці і заробкаў. Што тут хаваць? Мы ідзём да людзей і просім іх нас падтрымаць. Як вас чалавек падтрымае, калі мы ім не дапаможам? Тое, што дзяржава павінна заплаціць, яна заплаціла. Трапілі прадпрыемствы, працоўныя калектывы ў складаную сітуацыю — мы ім павінны дапамагчы зараз», — падкрэсліў беларускі лідар.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Эканоміка Новай Зеландыі абваліцца на 20 працэнтаў

ВУП Новай Зеландыі сёлета ў першым квартале ўпаў на 1,6 працэнта адносна чацвёртага квартала 2019 года і склаў 310 мільярдаў новазеландскіх долараў ($200 млрд), сведчаць даныя афіцыйнай статыстыкі. Эксперты мяркуюць, што падзенне ВУП можа дасягнуць 20 % у красавіку—чэрвені, піша The Wall Street Journal. «Вынікі за квартал паказалі маштабнае падзенне эканамічнай актыўнасці, таму што абмежаванні на паездкі ўступілі ў сілу і краіна перайшла да закрыцця эканомікі», — адзначаецца ў паведамленні статупраўлення, у якім таксама падкрэсліваецца, што падзенне ВУП у студзені—сакавіку аказалася самым моцным за 29 гадоў.

Названы пераможца ў гандлёвай вайне ЗША і Кітая

Дзве найбуйнейшыя эканомікі свету сталі менш канкурэнтаздольныя з-за гандлёвай вайны, адзначаецца ў даследаванні Міжнароднага інстытута кіраўніцкага развіцця (IMD). ЗША апусціліся на сем пазіцый у рэйтынгу канкурэнтаздольнасці да дзясятага месца, а Кітай страціў шэсць пазіцый, апынуўшыся на 20-м. У выніку іншыя краіны, якія змаглі падняцца вышэй у рэйтынгу, названы пераможцамі ад супрацьстаяння дзвюх краін. Так, Сінгапур, Данія і Швейцарыя палепшылі свае пазіцыі і ўзначалілі спіс. Гандлёвыя войны нанеслі шкоду эканомікам Кітая і ЗША, цалкам змяніўшы траекторыі іх росту, адзначаецца ў справаздачы IMD. Рэйтынгі IMD ацэньваюць 63 краіны па сотнях фактараў, такіх як занятасць, кошт жыцця, дзяржаўныя выдаткі, палітычная стабільнасць і абарона правоў інтэлектуальнай уласнасці.

Млечны шлях змяшчае звыш 30 пазаземных цывілізацый



Да такой высновы прыйшлі даследчыкі з Натынгемскага ўніверсітэта, перадае нямецкі часопіс Der Spiegel. «Па ацэнцы навукоўцаў, у нашай роднай галактыцы можа існаваць каля 36 разумных цывілізацый. Аднак з дапамогай цяперашняй тэхнікі выявіць іх або звязацца з імі вельмі цяжка, — адзначаюць эксперты ў навуковым часопісе The Astrophysical Journal. — Ідэя заключаецца ў разглядзе эвалюцыі ў касмічным маштабе. Калі выказаць здагадку, што на іншых планетах, як і на Зямлі, для развіцця разумнага жыцця патрабуецца каля 5 мільярдаў гадоў, то ў нашай галактыцы павінна быць як мінімум некалькі дзясяткаў актыўных цывілізацый».

ISSN 1990 - 763X

КАРАТКА

- **Сёння пачынаецца падача дакументаў для рэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты.**
- Персанал БелАЭС упершыню ўзяў удзел у міжсістэмнай супрацьаварыйнай трэніроўцы.
- **У Беларусі зменены тэрміны ўступнай кампаніі.**
- Інтэрактыўную адукацыйную экалагічную сцежку для дашкалят распрацавалі студэнты БДУ.
- **Ордэнам Маці ўзнагароджаны 114 беларусак.**

Падрабязнасці

Сістэмна і доўгі час

Злачынныя дзеянні фігурантаў справы Белгазпрамбанка стварылі рэальную пагрозу інтарэсам нацыянальнай бяспекі Беларусі

Пра гэта журналістам паведаміў генеральны пракурор Аляксандр КАНЮК. У Генеральнай пракуратуры ў адпаведнасці з заканадаўствам разгледжаны матэрыялы крымінальнай справы Белгазпрамбанка, якія паступілі з Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК для вызначэння падследнасці.

«Па выніках іх вывучэння з улікам наяўных доказаў Генеральная пракуратура прыйшла да адназначнай высновы аб неабходнасці кваліфікацыі дзеянняў асоб, якія праходзяць па справе, як учыненых у складзе злачыннай арганізацыі. У сувязі з чым мною прынята рашэнне аб узбуджэнні крымінальнай справы па частках 2 і 3 артыкула 285 Крымінальнага кодэкса», — праінфармаваў Аляксандр Канюк.

«З улікам таго, што злачынныя дзеянні здзяйсняліся сістэмна, на працягу доўгага часу, з выкарыстаннем транснацыянальных супрацьпраўных схем, яны стварылі рэальную пагрозу інтарэсам нацыянальнай бяспекі нашай краіны як у фінансавай, так і іншых сферах, — падкрэсліў генпракурор. — Таму далейшае расследаванне гэтай крымінальнай справы даручана следчым падраздзяленням органаў дзяржаўнай бяспекі Беларусі».

У той жа час аператыўнае суправаджэнне расследавання крымінальнай справы будзе ажыццяўляць ДФР КДК, дадаў Аляксандр Канюк.

Паводле БелТА.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«ДЛЯ МЯНЕ НЯМА БОЛЬШАЙ КАШТОЎНАСЦІ, ЧЫМ БЕЛАРУСЬ, СУВЕРЭННАЯ І НЕЗАЛЕЖНАЯ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І адзначыў, што асобныя нашы банкі, асабліва такія, як Беларусбанк або Белаграпрамбанк, ужо скардзіліся на закрыццё знешніх лімітаў з боку Расіі.

«Зразумела, што Расія заняла як мінімум чакальную пазіцыю. Нешта ім не падабаецца. Магчыма, з-за газпрамаўскага банка пакрыўдзіліся», — пракаментаваў Прэзідэнт і заявіў, што наш бок гатовы даць усе тлумачэнні па сітуацыі з Белгазпрамбанкам.

ЯК АДРОЗНІЦЬ «ЧОРНЫ» ДЗЕНЬ?

Другая тэма нарады больш стратэгічная — як крэдытаваць эканоміку далей? Бягучыя цяжкасці вырашым, гарантаваў Прэзідэнт, але з наступнага года трэба расці сярэднесусветнымі тэмпамі.

«Апошнія пяць гадоў мы праводзілі жорсткую грашовую і валютную палітыку. Назапасілі пэўныя золатавалютныя рэзервы і рэшткі бюджэту. Заўсёды ведалі: гэта — на чорны дзень. Я не кажу, што ён настаў. І ў гэтым праблема. ***Мы не ведаем, як павядзе сябе сусветная эканоміка, ад якой мы залежым,*** — адзначыў Прэзідэнт. — Складанасць у тым: чорны сёння дзень, ці будзе яшчэ чарнейшы, як у іншых краін».

Але ўлады адназначна павінны, як акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка, задаць трэнд на змякчэнне фінансавай палітыкі. Неабходна задзейнічаць абсалютна ўсе сродкі для папаўнення рэсурснай базы нашых банкаў (дэпазітныя аўкцыёны Мінфіна, паслабленне рэзервовых патрабаванняў Нацбанка для падтрымання ліквіднасці, прыбытак банкаўскай сістэмы і падобнае) і пастаяннага росту крэдытавання эканомікі.

«Прашу не заціскаць гэтыя ўмовы. І ***прэм'ер-міністр, і кіраўнік Нацбанка адналькава адказваюць за рост ВУП і даходаў насельніцтва, стрымліванне цэн.*** А ад сёння старшыня Нацбанка з'яўляецца галоўным памочнікам прэм'-ер-міністра па выплаце заробкаў і рабоце гэтых прадпрыемстваў, — паведаміў Прэзідэнт. — Паглядзіце і па стаўцы рэфінансавання. Усе краіны яе актыўна зніжаюць, спрабуючы ажывіць сваю эканоміку. Індэкс спажывецкіх цэн у нас у параметрах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, таму кошт банкаўскага крэдыту трэба памяншаць больш актыўна. Чакаю рашэнняў Нацбанка, не пазней за канец чэрвеня».

«НАМ УСЁ РОЎНА, ЯКІ БАНК. ЁСЦЬ ЗАКОН — ВЫКОНВАЙ ГЭТЫ ЗАКОН!»

Прэзідэнт пацікавіўся пазіцыяй прысутных па тэме, якая запушчана ў СМІ «асобнымі правакатарамі», пра ледзь не развал «дочак» расійскіх банкаў у Беларусі.

«Абвінавацілі ўлады ў пераводзе рахункаў дзяржпрадпрыемстваў і гэтак далей», — пракаментаваў кіраўнік дзяржавы і прапанаваў аперыраваць фактамі.

«З аднаго боку, тыя ж выданні ў інтэрнэце штодня праклінаюць дзяржсектар, абвінавачваюць яго ва ўсіх смяротных грахах. І страты там, і даўгі, і заробкі не тыя. Нявыгадна з імі працаваць. Але калі недзе дзяржава як асноўны ўласнік пераходзіць на абслугоўванне, скажам, у Белаграпрамбанк, што тут не рынечна? Што тут не так? — задаў ён рытарычнае пытанне. — Значыць, трэба прапанаваць лепшыя ўмовы».

«Не адцягваць фінансавыя рэсурсы на тое, каб буржуям набіць кішэні і закупіць карціны, увезці ў краіну як мецэнаты, — працягнуў думку Аляксандр Лукашэнка. — Цікава, для інфармацыі: вялікі мецэнат! І ўсе ў гэта паверылі. Асабліва нашы тут, у Мінску. Ну, я думаю, дзякаваць богу, прывезлі карціны. Не, ніякі не мецэнат! Карціны не прывезлі сюды для беларускага народа і дзяржавы. Карціны гэтыя — ічнія! Як яны заяўляюць: акцыянераў Белгазпрамбанка. Мы цяпер бачым, якіх акцыянераў. Усе яны прызналіся, адкуль карціны, за якія грошы закупляліся. І толькі па ацэначным кошце там больш за 20 мільёнаў долараў. Толькі па карцінах!»

Адказаў кіраўнік дзяржавы і на пытанне, чаму раней не стартавала расследаванне супрацьпраўнай дзейнасці кіраўніцтва Белгазпрамбанка: «Дык раней яны яшчэ канцы ў ваду не хавалі. ***Сёння мы ядзім пірог, бо ўчора яго яшчэ не спяклі.*** Таму асабліва спачуваючых хачу папярэдзіць: ***вы нас не прыспешвайце, мы разбяромся з усімі пытаннямі.*** А калі ў кагосьці ёсць пытанні, вось, калі ласка, Іван Станіслававіч Тэртэль (старшыня КДК. — **«Зв.»**). Два разы ён растлумачыў усяму грамадству, калі трэба, трэці раз растлумачыць. І, калі трэба, падключацца іншыя і растлумачаць».

Наколькі правамерна аддаваць прыбытак банка на выбарчую кампанію? Гэтым пытаннем задаўся Аляксандр Лукашэнка. Справа не ў паходжанні банка, падкрэсліў ён. Ёсць іншыя банкі расійскага паходжання, напрыклад БПС-Ашчадбанк, які актыўна ўдзельнічае ў продажы беларускай тэхнікі па добрых экспартных праграмах у Расію і за мяжу.

«Плюс у нас з Грэфам (Герман Грэф — прэзідэнт і старшыня Праўлення Ашчадбанка Расіі. — **«Зв.»**) адбудзецца ў найбліжэйшы час сустрэча — ён нам хоча прапанаваць выгадны крэдыт на паўмільярда долараў. Дзякуй яму. Ён выгадны, мы пагодзімся, возьмем. Гэты чалавек займаецца не палітыкай, а непасрэдна сваімі справамі», — дадаў беларускі лідар.

Ёсць і банк БелВЭБ з крэдытам на атамную станцыю, працягнуў Аляксандр Лукашэнка. Пакуль фінансавыя структуры працуюць на эканоміку краіны, пытанняў да іх не ўзнікае, адзначыў ён. І не важная іх краінавая прыналежнасць.

«Нам усё роўна, які банк. Ёсць закон — выконвай гэты закон!» — падсумаваў тэму Прэзідэнт.

«МЫ НІ ПАД КОГА СКАКАЦЬ НЕ БУДЗЕМ»

Яшчэ адна тэма нарады — перамовы з Міжнародным валютным фондам. Было заяўлена пра магчымасць даць Беларусі 940 мільёнаў долараў так званага хуткага фінансавання. На гэты конт Прэзідэнт цвёрда заявіў: «Мы ні пад кога скакаць не будзем. Там ужо з'яўляюцца патрабаванні: вы, маўляў, у барацьбе з каранавірусам у Беларусі рабіце, як у Італіі. Слухайце, я не хачу, каб, не дай бог, у Беларусі паўтарылася сітуацыя, як у Італіі! Я гэтага не хачу. ***У нас свая краіна, свая сітуацыя. І дай бог, каб мы далей закончылі з гэтым каранавірусам, як зараз».***

Сусветны банк гатовы, па словах Аляксандра Лукашэнкі, выдзеліць Беларусі фінансаванне ў дзесяць разоў большае, чым прапаноўваў першапачаткова, таму што ўбачыў эфект ад абранага дзяржавай шляху змагання з каранавірусам. «Нават вопыт запытаў у Міністэрства аховы здароўя, — акцэнтаваў ён. — А МВФ патрабуе ад нас ізаляцыі, каранціну і каменданцкай гадзіны...»

НЕ ЛЕПШЫЯ ЗА ЖКГ І МЕДЫКАЎ

Не пакінуў убаку Прэзідэнт і пытанне задаволенасці работай банкаўскай сістэмы з боку спажыўцоў.

«Такая ацэнка павінна быць не толькі ў ЖКГ або, скажам, медыкаў. Чым вы лепшыя? Працуеце з людзьмі штодня. Мяне турбуюць частыя выпадкі кібермахлярства, спісання сродкаў з банкаўскіх картак і падобныя злачынствы, — абазначыў беларускі лідар. — Нават у гэтым Белгазпрамбанку дайшлі да таго, што на паўдня змянілі курс, каб работнікі банка змаглі памяняць свае грошы на долары па меншым курсе, і да вечара зноў яго паднялі».

Ён дадаў, што гэтая інфармацыя яшчэ правяраецца, але калі яму далажылі, значыць, яна небеспадстаўная.

Кіраўнік дзяржавы таксама ведае, што прадпрыемствы скардзяцца на завышаныя расцэнкі на банкаўскія паслугі. Напрыклад, такія як эквайрынг (безнаяўная аплата ў краме, у інтэрнэце або праз тэлефон).

«А Міністэрства па антыманапольным рэгуляванні і гандлі куды глядзіць? Куды ва ўрадзе адпаведныя людзі глядзяць?» — спытаў ён удзельнікаў нарады.

Патрабаванне Прэзідэнта — да верасня зрабіць рашучыя дзеянні «па спыненні буржуяў у гандлі, уразанні іх апетытаў» — па абмежаванні банкіраў у імкненні нажывацца за кошт накруток па працэнтах і шматлікіх плат за абслугоўванне.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
Марыя ДАДАЛКА.

Блізкая ўлада

ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

На наступным тыдні Адміністрацыя Прэзідэнта прадоўжыць у планавым парадку праводзіць выязныя прыёмы грамадзян і прамыя тэлефонныя лініі ў розных рэгіёнах краіны. Нумары тэлефонаў размешчаны на сайтах мясцовых органаў улады, а таксама ў сродках масавай інфармацыі.

У панядзелак, 22 чэрвеня, з 10 да 12 гадзін у Дзяржынскім райвыканкаме пройдзе прамая тэлефонная лінія з удзелам начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення **Вольгі Аляксандраўны ШПІЛЕЎСКАЙ.** Асабісты прыём грамадзян пачнецца з 12.00.

23 чэрвеня ў Светлагорскім райвыканкаме будзе працаваць **начальнік галоўнага ўпраўлення па ўзаемаадносінах з органамі заканадаўчай і судовай улады, пытаннях грамадзянства і памілавання Жанна Віктараўна ЦІШЧАНКА.** Прамая лінія пройдзе з 11 да 13 гадзін, у 13 гадзін пачнецца асабісты прыём грамадзян.

Маёру Гаўрылаву і іншым...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сцяг у вядры і 1800-кілаграмовая бомба

Але ж галоўная тэма экспазіцыі — абарона Усходняга форта ў чэрвені 1941 года і лёс яго абаронцаў. Гэтай тэме прысвечаны экспанаты ўнутры і ўнутрыфортавая тэрыторыя, якая ўтварыла мемарыяльную зону памяці. На апошняй увекавечаны імёны многіх герояў абароны.

У адной з залаў размешчаны сцяг 393-га асобнага зенітна-артылерыйскага дывізіёна 42-й арміі. Цікавая гісторыя гэтага штандара. Малодшы сяржант Радзівон Семянюк разам з таварышамі загарнулі сцяг у брызент, паклалі ў вядро, якое знайшлі ў канюшні, а потым закрылі яшчэ адным цынкавым вядром, і так закапалі ў адным з казематаў. Цалюткім, без бачных пашкоджанняў сцяг быў адкапаны ў 1956 годзе. І аказалася, што гэта адзіны з баявых сцягоў музея абароны крэпасці, які захаваўся ў такім добрым стане, ад астатніх былі знойдзены фрагменты. «Сцяг вырашана перамясціць сюды, у новую экспазіцыю», — адзначыла Ларыса Бібік.

Бамбардзіроўцы форта прысвечаная яшчэ адна зала экспазіцыі. Ёсць дакументальныя сведчанні гэтай драматычнай старонкі абароны, яны прадстаўлены ў выглядзе нямецкіх данясенняў. У адным з іх гаворыцца: «29.6. з 8.00 авіяцыя скінула многа 500-кілаграмовых бомбаў, аднак безвынікова. Такім жа безвыніковым аказаўся новы інтэнсіўны артабстрэл Усходняга форта танкамі і штурмавымі гарматамі, нягледзячы на тое, што сцены ў асобных месцах былі разбураны. Пасля паўдня авіяцыя зноў стала скідваць 500-кілаграмовыя бомбы. Калі пры гэтым была скінутая 1800-кілаграмовая бомба, рускія памякчэлі». Так выглядала гэтае пекла вачыма праціўніка. Можна ўявіць, што рабілася ўнутры. Дарэчы, вядомыя памеры той памянёнай гіганцкай бомбы: 3.50 на 60 сантыметраў. Для таго каб трапіць дакладна ў форт такім боепрыпасам, шукалі лётчыка-аса. А сам форт немцы абкладвалі белымі прасцінамі, каб пілот бачыў цэль. Ад выбуху дрыжэлі і лопаліся шыбы ў горадзе.

Легендарны маёр

Вядома, цэнтральнай фігурай абароны Усходняга форта з'яўляецца Пётр Гаўрылаў. Гэтага чалавека заўсёды згадваюць у кантэксце гераічнай абароны крэпасці. Яго заслугі прызнаваў і непрыяцель. У баявым данясенні камандзіра 45-й пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнанта Шліпера афіцэра называюць «душой супраціўлення». Пётр Міхайлавіч і быў тым самым «невядомым маёрам», якога ў канцы чэрвеня ні сярод загінулых, ні сярод палонных савецкіх воінаў немцы не знайшлі. Ён трапіць у палон 23 ліпеня. А да гэтага будзе абараняцца. Спачатку ў складзе трох рот. Потым з астаткамі групы ў 12 чалавек з трыма кулямётамі, а ў канцы — калі застанецца адзін. І толькі параненага, зусім знясіленага яго знойдуць 23-га чысла. Сяргей Смірноў у сваёй кнізе «Брэсцкая крэпасць» так апісаў момант захопу ў палон: «Палонны маёр быў у поўнай камандзірскай форме, але яго адзенне ператварылася ў лахманы, твар быў пакрыты сажай і пылам, аброс барадой... Гэта быў ў поўным сэнсе слова шкілет, які абцягнуты скурай. Да якой ступені дайшло змардаванне, можна было меркаваць па тым, што палонны не мог нават зрабіць глытальны рух: у яго не хапала на гэта сіл, і дактарам давялося прымяніць штучнае харчаванне, каб выратаваць яму жыццё. Але нямецкія салдаты, якія бралі яго ў палон і прывезлі ў лагер, расказалі ўрачам, што гэты чалавек, у чыім целе ледзьве трымцела жыццё, усяго гадзіну таму, калі яны засталі яго ў адным з казематаў, у адзіночку прыняў бой, кідаў гранаты, страляў з пісталета, забіў і параніў некалькі ворагаў».

Менавіта Сяргей Смірноў дапамог герою аднавіць яго добрае імя. Пасля выступленняў пісьменніка Гаўрылаву вярнулі званне і ўзнагароды, якіх пазбавілі без падстаў, а пазней прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. Пётр Міхайлавіч пражыў жыццё ў Расіі, а пасля смерці завяшчаў пахаваць сябе ў Брэсце.

Дырэктар мемарыяльнага комплексу Рыгор БЫСЮК расказаў, што сёлета не будзе традыцыйнага масавага мітынгу-рэквіема і гістарычнай рэканструкцыі ў ноч на 22 чэрвеня. Замест іх адбудзецца ўшанаванне памяці, ускладанне вянкоў, аўдыятрансляцыя загадзя падрыхтаваных праграмы. Адкрыццё новай экспазіцыі запланавана на 15 гадзін 23 чэрвеня.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

СУТЫКНУЦЬ БЕЛАРУСЬ І РАСІЮ НЕ АТРЫМАЕЦЦА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗАМ З СЫНАМІ БУДЗЕ ПРЫСУТНІЧАЦЬ НА ПАРАДЗЕ Ў МАСКВЕ

Ён прыняў запрашэнне Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна наведаць гэтае ўрачыстае мерапрыемства, якое адбудзецца 24 чэрвеня на Краснай плошчы, падчас учарашняй тэлефоннай гутаркі.

Размова прэзідэнтаў, акрамя парада, датычылася яшчэ дзвюх тэм. Кіраўнікі дзяржаў падрабязна абмеркавалі сітуацыю з каранавірусам у Расіі і Беларусі, яе развіццё і супрацьдзеянне. Уладзімір Пуцін расказаў пра новыя эфектыўныя лекі, атрыманыя на аснове японскіх прэпаратаў. Прэзідэнт Расіі прапанаваў пры неабходнасці ў патрэбным аб'ёме скарыстацца гэтым прэпаратам у Беларусі. Як перадае прэс-служба Прэзідэнта Беларусі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што лекі будуць закуплены.

Кіраўнікі краін таксама абмеркавалі сітуацыю ў эканоміцы — далейшыя перспектывы, кантакты — і дамовіліся аб адмысловай сустрэчы.

У той жа дзень Прэзідэнт Беларусі прыняў з візітам міністра замежных спраў Расіі Сяргея Лаўрова.

«У нас сапраўды была такая адкрытая шчырая размова, хоць многія думаюць, што ў нас тут нешта іскрыць. Нічога не іскрыць. Ёсць праблемы заўсёды...» — расказаў Аляксандр Лукашэнка расійскаму міністру пра тэлефонную размову з Уладзімірам Пуціным і цалкам пагадзіўся з метафарай суразмоўцы пра іскру запальвання, без якой немагчымая работа рухавіка.

«Хапае, вядома, праблем і ў нас, і ў вас — і з гэтай пандэміяй, яна абвастрыла многія праблемы і на міжнародным узроўні, вы гэта лепш за мяне адчуваеце і разумееце. У вас сёння і палітычных праблем вышэй даху ў сувязі з прыняццем новых паправак у Канстытуцыю. У нас — прэзідэнцкія выбары. Таму, сапраўды, як у братоў, усё ідзе паралельна і адлюстроўваюцца гэтыя праблемы, але, я думаю, мы іх вырашым, — выказаў упэўненасць беларускі лідар. — Гэта не катастрафічныя праблемы».

Калі нехта разлічвае сутыкнуць Беларусь і Расію і пагоршыць іх адносіны, гэта не атрымаецца, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Пераадолеем і пандэмію, і інфапандэмію, і эканамічную пандэмію, і нафтавую, газавую пандэмію — усё гэта мы пераадолеем. Гэта ў нашых сілах», — не сумняваецца беларускі лідар.

Сяргей Лаўроў падзякаваў за прыём і за супрацоўніцтва паміж знешнепалітычнымі ведамствамі, якое ажыццяўляецца на падставе ўхваленага двума прэзідэнтамі двухгадовага плана. Адзін з крокаў у рамках гэтага супрацоўніцтва — падпісанне пагаднення аб узаемным прызнанні віз. Яно адбылося ўчора пазней у МЗС.

«Што будзе мець вялікае значэнне для грамадзян трэціх краін, якія наведваюць Расію і Беларусь, для бізнесменаў, якія працуюць тут і ў Расійскай Федэрацыі, і, вядома, для дыпламатаў, якія адначасова акрэдытаваныя ў Маскве і Мінску, — заўважыў Лаўроў. — Таму, думаю, гэта будзе вельмі добра ўспрынята і на справе прадоўжыць наша сумеснае будаўніцтва Саюзнай дзяржавы».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
Марыя ДАДАЛКА.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Крупский плодоовощной завод»

№ лота	Наименование лота	Начальная стоимость с НДС 20 %	№ лота	Наименование лота	Начальная стоимость с НДС 20 %
2	капитальное строение с инв. № 613/С-10559 (здание склада-арочника № 2), площадь 490 м²	8352,00	9	капитальное строение с инв. № 613/С-13485 (котельная), площадь 199,9 м²	3108,00
3	капитальное строение с инв. № 613/С-13481 (здание кисельного и горчичного цеха), площадь 813,6 м²	6576,00	10	капитальное строение с инв. № 613/С-13482 (погреб), площадь 47,4 м²	348,00
4	капитальное строение с инв. № 613/С-13480 (проходная), площадь 54,1 м²	3456,00	11	капитальное строение с инв. № 613/С-13484 (гараж на 4 бокса), площадь 119,5 м²	972,00
5	капитальное строение с инв. № 613/С-13527 (здание цеха безалкогольных напитков), площадь 416,2 м²	5268,00	13	капитальное строение с инв. № 613/С-13560 (водонапорная башня), площадь 35,3 м²	420,00
6	капитальное строение с инв. № 613/С-13528 (здание цеха по переработке яблок), площадь 249,2 м²	2124,00	14	капитальное строение с инв. № 613/С-13478 (здания мастерских), площадь 169,8 м²	1536,00
7	капитальное строение с инв. № 613/С-13526 (здание цеха для брожения вина), площадь 157,7 м²	2028,00	15	капитальное строение с инв. № 613/С-13479 (спиртохранилище), площадь 104,4 м²	948,00
8	капитальное строение с инв. № 613/С-13477 (производственный корпус), площадь 201,6 м²	2556,00	16	капитальное строение с инв. № 613/С-10557 (здание склада материальных ценностей), площадь 250 м²	1068,00
18	капитальное строение с инв. № 613/С-13559 (артезианская скважина)				588,00

В отношении вышеперечисленного имущества проводятся десятые повторные торги. Лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером № 623050100001002242 по адресу: г. Крупки, ул. Московская, 1. Земельный участок предоставлен для обслуживания зданий и сооружений производственный базы на праве аренды до 2102 года. Публикация об аукционе ранее размещалась 14.04.2020 г. в газете «Звязда» № 72 (29186), стр. 15. Цена на лоты №№ 2, 4 снижена на 80 %, на лоты №№ 3, 5–18 – на 90 %.
Начало приема заявлений в 10.00 22.06.2020. Окончание приема заявлений в 17.00 06.07.2020

Задаток	10 % от начальной стоимости предмета торгов
Шаг аукциона	5 % от начальной стоимости предмета торгов
Организатор торгов	ООО «Фрондера», +375 29 308 28 97; e-mail: info.torgi@orgtorg.by
Информация о продавце	ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», +375 29 304-59-90)
Дата и время проведения торгов	**07 июля 2020 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121

Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121 либо по электронной почте: info.torgi@orgtorg.by

Условия для участия в торгах

1. До подачи заявления внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Крупский плодоовощной завод» (Лот №__), проводимом 07.07.2020 г.».
2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте **https://orgtorg.by/info/.** Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 14 (четырнадцати) дней с момента подписания протокола о результатах аукциона и возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету). Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.
Вознаграждение аукциониста – 10 % от конечной цены предмета торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов: +375 29 304-59-90.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**
Продавец: **ОАО «Трест Белстроммонтаж» (УНП 100135597)** в лице ликвидатора ООО «Партнер-Консультант», тел.: +375 17 392-70-60, +37529 304-59-90.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **21 апреля 2020 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб., с НДС	Шаг торгов (5 %), бел. руб.	Сумма задатка (10 %), бел. руб.
1	Резчик швов HCC20A-CH с двиг. хонда ENGINE, инв. № 720	672,00	33,60	67,20
2	Прибор для резки плитки 630 мм (ролик 22 мм) шт 268.20, инв. № 77755	115,20	5,76	11,52
3	Вибротрамбовка RAM-70HD C/W с двигателем Хонда GX, инв. № 712	816,00	40,80	81,60
4	Водонагреватель проточный эл. ЭПВН-7,5 кВт 220В, инв. №770	72,00	3,60	7,20
5	Веерная щитовая опалубка колонн системы Н=3,0 м	3 744,00	187,20	374,40
6	Веерная щитовая опалубка колонн системы Н=3,3 м	4 080,00	204,00	408,00
7	Вагон-бытовка (инв. № 14)	1 344,00	67,20	134,40
8	Вагон-бытовка (инв. № 724)	1 584,00	79,20	158,40
9	Станок СР-36	1 200,00	60,00	120,00
10	Экскаватор Е-140W (рег. знак СВ-4 9425), 2013 г. в.	32 688,00	1 634,40	3 268,80
11	Вагон-бытовка (инв. № 418) + печь отопительно-варочная НОРМАЛЬ-2	1 388,80	69,44	138,88
12	Вагон-бытовка (инв. № 423) + печь отопительно-варочная НОРМАЛЬ-2	2 534,40	126,72	253,44

Местонахождение – г. Гродно, ул. Дубко, 11, тел. для ознакомления +37529 589-41-34.

Для участия в торгах необходимо с 08.04.2020 г. с 09.00 по 20.04.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 30.01.2020 г.

Утеряное свидетельство о государственной регистрации ООО «Слим энд Лайт», УНП192423642, **считать недействительным.**

Утерянные представительством Белгосстраха по Мядельскому району страховые полисы по добровольному страхованию имущества граждан формы 2РН серии ИГ № 8958056 и № 8958057 в количестве 2 шт. **считать недействительными.**
УНП 100122726

РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 23.07.2020 повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 613/С-14406 общей площадью 114,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, М-1, 471-й км, 1, в районе д. Дубешня. Назначение: здание специализированное общественного питания, наименование: кафе «Нача». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623083300001000032 площадью 0,1184 га. **Начальная цена продажи – 37 368,00 бел. рубля, задаток – 3 736,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-35057 общей площадью 19,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Чапаева, д. 82. Назначение: здание специализированное транспорта; наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 640400000014000175. **Начальная цена продажи – 6 048,00 бел. рубля, задаток – 604,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-30286 общей площадью 19,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Чапаева, 82. Назначение: гараж; наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 640400000014000175 площадью. **Начальная цена продажи – 6 048,00 бел. рубля, задаток – 604,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. Объект недвижимого имущества в составе садового дома с инвентарным номером 601/С-10150 общей площадью 55,0 кв. м, расположенного по адресу: Минская обл., Логойский район, Острошицкий с/с, СТ «Связист», в/ч06468, 66 на земельном участке с кадастровым номером 623286300006000073 площадью 0,0450 га. Назначение: садовый, дачный домик (дача), наименование: садовый домик. **Начальная цена продажи – 11 790,00 бел. рубля, задаток – 1 179,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-19573 общей площадью 753,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Мультана, д. 106. Назначение: здание неустановленного назначения, наименование: цех мешкопилок. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 620450100001000084 площадью 5,8422 га. **Начальная цена продажи – 43 308,00 бел. рубля, задаток – 4 330,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-40066 общей площадью 794,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Пригородный с/с, д. Углы. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 620887409101000732 площадью 0,1861 га. **Начальная цена продажи – 99 684,00 бел. рубля, задаток – 9 968,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Изолированное помещение с инвентарным номером 700/D-103355 общей площадью 95,8 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Октябрьский 3-й, 7А-10. Назначение: квартира, наименование: квартира № 10 *(число комнат – 3, этаж – 4, год постройки – 2011)*. **Начальная цена продажи – 164 700,00 бел. рубля, задаток – 16 470,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Капитальное строение с инвентарным номером 311/С-50774 общей площадью 100,1 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Добрушский р-н, г. Добруш, пр-т Луначарского, 11А. Назначение: здание специализированное розничной торговли, наименование: магазин «Запчастей». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321250100002000030 площадью 0,0312 га. **Начальная цена продажи – 38 250,00 бел. рубля, задаток – 3 825,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Машино-место с инвентарным номером 500/D-798789314 общей площадью 12,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Рокоссовского, 150Б-120. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000003002741 площадью 0,2239 га. **Начальная цена продажи – 14 256,00 бел. рубля, задаток – 1 425,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 10. Машино-место с инвентарным номером 500/D-798789315 общей площадью 12,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Рокоссовского, 150Б-121. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000003002741 площадью 0,2239 га. **Начальная цена продажи – 14 256,00 бел. рубля, задаток – 1 425,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 11. Машино-место с инвентарным номером 500/D-798789316 общей площадью 13,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Рокоссовского, 150Б-122. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000003002741 площадью 0,2239 га. **Начальная цена продажи – 14 256,00 бел. рубля, задаток – 1 425,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 12. Капитальное строение с инвентарным номером 645/С-5039 общей площадью 185,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Стародорожский р-н, г. Старые Дороги, ул. Урицкого, д. 30. Назначение: здание специализированное для производства строительных материалов, наименование: растворо-бетонная установка. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625250100037000006 площадью 2,7499 га. **Начальная цена продажи – 23 587,20 бел. рубля, задаток – 2 358,72 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 13. Земельный участок с кадастровым номером 624881700027000198 общей площадью 0,0954 га, расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Плисский с/с, садоводческое товарищество «Ремонтник», участок № 42. Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 2 720,00 бел. рубля, задаток – 272,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 14. Изолированное помещение с инвентарным номером 714/D-15329 общей площадью 46,8 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Осиповичский р-н, Протасевичский с/с, д. Цель, ул. Восточная, 7-38. Назначение: квартира; наименование: квартира. **Начальная цена продажи – 12 537,

З гісторыі пытання

МЕСЦА, ДЗЕ ПРАЙШЛО ДЗЯЦІНСТВА

Спачатку Годам малой радзімы ў Беларусі быў аб'яўлены 2018-ы. Аб гэтым рашэнні Прэзідэнт паведаміў 9 лютага 2018 года на ўрачыстай цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод найлепшым працаўнікам аграрнай сферы. Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што рашэнне выклікалі разважанні аб важнасці малой радзімы ў лёсе кожнага чалавека. «Яна шматаблічная. Для адных гэта родны горад, вуліца ў горадзе або невялікі дворык, вёска, дзе прайшлі найлепшыя дзіцячыя гады, для іншых — кавалачак дзікай прыроды, які радаваў вока і дарыў пачуццё напоўненасці і спакою. А для тых, хто паехаў шукаць шчасце ў іншыя краіны, малой радзімай стала Беларусь», — сказаў ён.

Прэзідэнт тады падкрэсліў і потым увесь час нагадваў пра тое, што настаў час кожнаму не толькі ўспомніць аб сваіх каранях, аб месцы, дзе засталася часцінка душы, але і аддаць доўг гэтаму кавалачку зямлі. «Вельмі хочацца, каб дапамога ішла ад сэрца, стала ўласнай ініцыятывай. Яна можа быць матэрыяльнай, стваральнай, асветніцкай, творчай — тут усё ад жадання і магчымасцяў. Настаў момант праявіць сябе і ўпісаць сваё імя ў гісторыю гэтай малой радзімы, гэтага кавалачка нашай зямлі», — заявіў беларускі лідар.

Ідэя, сапраўды прыгожая і натхняльная. У першую чаргу Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад усёй уладнай вертыкалі ўспомніць пра мясціны, з якіх выйшлі высокапастаўленыя чыноўнікі, і навесці парадак там.

Так, напрыклад, даручаючы тагачаснаму намесніку прэм'ер-міністра Міхаілу Русаму пабудаваць да канца года мост паміж Жыткавічамі і Тураваm, Прэзідэнт казаў: «У мяне гэтае пытанне на кантролі. Але гэта твая радзіма, і ў Год малой радзімы ты не павінен ад гэтага адвярнуцца».

Пазней ён прапанаваў дзяржслужачым наведаць свае мясціны падчас рэспубліканскага суботніка і сам падаў прыклад, добраўпарадкоўваючы Трафімаву крыніцу на сваёй малой радзіме разам з трыма сынамі. Тады кіраўнік дзяржавы паведаміў журналістам, што Год малой радзімы будзе падоўжаны і на два наступныя гады, да 2020-га.

15.3. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет участнику), операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.) и почтовой службы (сроки доставки и т. д.).

15.4. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

15.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

15.6. Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Козлова, 25, пом. 22.

Свидетельство № 3802 о регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 8 июня 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 21 (509)

На экранах

Яшчэ дзве нашы рэчаіснасці

Расказваем пра фільмы, што прадстаўлялі краіну на Кракаўскім кінафестывалі

Некалі ў Кракаве яны пазнаёміліся — масціты ўжо беларускі дакументаліст Віктар Аслюк, той самы, што, як кажуць, прынёс «Беларусьфільму» найбольшую колькасць узнагарод, і малады аўтар Андрэй Куціла, які сёння лічыцца адным з найцікавейшых беларускіх рэжысёраў. Сёлета абодва дакументалісты са сваімі работамі трапілі ў конкурсныя праграмы Кракаўскага фестывалю дакументальнага кіно, а Куцілаў фільм «Мне трэба поціскаў» яшчэ і атрымаў спецыяльную згадку журы. Нешта ў завіслым праз «ковід» кіно ўсё ж адбываецца — мы гэтыя «падзеі» паглядзелі і расказваем, што з беларускай рэчаіснасці гэтым разам трапіла ў поле зроку найлепшых беларускіх дакументалістаў.

«Эпітафія».

Аслюк і назіральнік ёсць сінонімы. Як у сваіх галоўных работах, рэжысёр удала заняў «пазіцыю» і зрабіў карціну-атмасферу «Эпітафія», прычым так своечасова пра могілкі — тэма смерці зараз папросту лунае ў паветры. Ён нават узяў героя: ім стаў складальнік каталога беларускіх могілак Андрэй Бурдзянкоў, але мужчына тут толькі выконвае функцыянальную ролю і трымае форму.

Галоўным прадметам увагі з'яўляюцца ўсё ж могілкі: праз чалавека, яго прысутнасць і адзінокае рабочае блуканне мы засяроджваемся на таварах на надмагіллях, становімся сведкамі стрыманых святкаванняў, трапляем у сакральную прастору, у якой трэба замаўчаць і нешта адчуць.

Здавалася б, мы што, могілак не бачылі? — ну, такім чынам не бачылі. А гэтае месца, як вядома, часта становіцца пунктам прыцягнення нават тых, хто не мае пахаваных на іх сваякоў. Сам Віктар Аслюк прызнаецца, што ў паездках пасля шпацыру па горадзе ідзе шукаць могілкі. І яны сапраўды цікавыя не фактурай, падзеямі ці гісторыямі — гэта ў першую чаргу адчуванне, і фільм намагаецца яго ўхапіць, нават здымае могілкі ноччу з абрысамі крыжоў і агнямі ў лампадках, што ўвогуле асобная гісторыя.

Адсюль, з-за канцэнтрацыі на даволі абстрактных рэчах, наратыў у карціне замяняецца эстэтыкай — адмысловай гукавой дарожцы, своеасаблівай несапраўднай колеравай гаме, шматлікіх партрэтах памерлых, паўтарэнне якіх уяўляецца мастацкім прыёмам.

Да таго ж апроч атмасферы могілкі ўтрымліваюць у сабе знакі культуры — іх мы тут таксама бачым, і на ўвазе маюцца не толькі сама па сабе «архітэктура» месца і бясконцыя фотаздымкі, але і, напрыклад, традыцыя накрытых на магілах сталоў. Аўтар бесстаронна назірае за людзьмі, якія, здаецца, ніякай атмасферы нідзе не адчуваюць, а нават яе перабіваюць, а гэта як назіраць за турыстамі ў «Аўстэрліцы» Сяргея Лазніцы, калі культурны элемент ператвараецца ў антрапалагічны. А і сапраўды, напэўна, галоўнае адчуванне на могілках — гэта адчуванне сябе жывым.

«Мне трэба поціскаў».

А на карціне «Мне трэба поціскаў» давялося пакруціць галавой ад узрушэння. Дакументальны фільм Андрэя Куцілы задумваўся як рэпартаж — ён і выглядае эсэ, эцюдам, мімалётным візітам у нікому невядомы дом у нікому невядомай вёсцы — а стаў усё ж менавіта мастацкім выказваннем. Гэта сумнае і няпростае відовішча: у вёсцы Бобры жыве незвычайная сям'я — яна складаецца з маці Валянціны, якой ужо за дзевяноста, і ад нараджэння паралізаванай амаль шасцідзесяцігадовай дачкі Таццяны, якую маці даглядае адна.

Фільм пачынаецца з нязмушанай і пустой балбатні вясковых бабуль у чаканні аўтакрамы — апроч іншага Валянціна купляе там пячэнне для Танюшы. А потым мы бачым, уласна, што Танюша — не дзяўчына і не звычайная жанчына, якая б увіхалася па гаспадарцы, а любоў, гора і матчын боль. Праўда, больш здагадваемся і даведваемся з маналогаў, чым бачым: Андрэй Куціла ўвайшоў у гэты дом далікатна, без відовішчных маніпуляцый і прагі да эмацыянальнага ўздзеяння. Адлюстраваць безвыходнасць і беспрасветнасць далікатнасць не перашкаджае.

Да таго ж манера камеры, а рэжысёр тут з'яўляецца адначасова і аператарам, і аўтарам сцэнарыя, сугучная паэзіі Таццяны, дакладней яе прысутнасці ў фільме. Запісаныя ў шматлікіх сшытках вершы паэткі Таццяны Бобрыкавай, прынамсі тыя адабраныя, што ў фільме ў выкананні актрысы Святланы Анікей гучаць па-за кадрам, расказваюць аб празе свабоды, жыцця і палётаў і разам з тым, што мы бачым, утвараюць, вядома, пранізлівы эфект.

Ну і стрыманасць камеры выйгрышна працуе на канцоўку, калі пасля маналогаў маці, шматлікіх дэталяў сямейнага быту, паказу таццяніных малюнкаў мы ўсё ж такі бачым аўтарку ўсіх тых няпростых слоў і яна нам усміхаецца. Але нам цяжка ўсміхнуцца ў адказ.

«Мне трэба поціскаў» хутка будзе таксама паказаны на міжнародным кінафестывалі ў іспанскім горадзе Уэска.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

На сцэне

РЭАЛЬНЫ ТЭАТР, ПАСЛЯВАЕННЫ РАСІЗМ І ЦЫРК

Усё цячэ, усё мяняецца — у нашу традыцыйную падчас «ковіду» падборку тэатральных пастановак, якія можна бяспечна глядзець дома на канапе, мы гатовы ўключыць два рэальныя спектаклі. Адны з найлепшых беларускіх тэатраў — РТБД і Купалаўскі — спрабуюць паволі пераходзіць у афлайн. Гэта вымагае дадатковых высілкаў, стварае абмежаванні па запаўняльнасці залы, бо паміж гледачамі мусіць захоўвацца дыстанцыя, і тэарэтычна накладвае на калектывы надзвычайную адказнасць. Але адначасова прапануе альтэрнатыву тым, хто праз тэатр на плоскім экране ўсвядоміў каштоўнасць тэатра жывога. Мы настойліва нагадваем, што наведванне публічных месцаў усё яшчэ небяспечнае, і ў якасці тэатральнай забавы на наступны тыдзень прапануем два выхады ў свет, зноў лонданскі Нацыянальны тэатр, оперу (можна проста слухаць) і кантэмпарары цырк.

«Шлюб з ветрам».

«Паўлінка» Купалаўскага тэатра

Тытульны спектакль Нацыянальнага нашага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, з якога традыцыйна пачынаецца амаль кожны яго сезон, стаў першым і пасля «ковіду» — з яго паказу 15 чэрвеня ў будынку на Энгельса ўзнавіліся сустрэчы з гледачамі. Як нешта «старое-добрае» і таксама паводле сюжэта пастаноўка сапраўды пасуе сённяшняй эпосе, калі змяняецца свет — яе прэм'ера ў рэжысуры Льва Літвінава адбылася ў 1944 годзе, і за гэтыя гады вечна актуальны спектакль заняў асаблівае месца ў рэпертуары тэатра. Камедыя Янкі Купалы, нагадаю, расказвае пра бойкую і вострую на язык Паўлінку, якая хоча ісці сваім шляхам, супярэчыць бацькоўскай волі, сама выбірае сабе жаніха і ўвогуле супрацьстаіць кансерватыўнаму парадку. Камедыя ў выніку робіцца трагедыяй. Наступны паказ спектакля адбудзецца 23 чэрвеня, зрэшты, «Паўлінку» ды іншыя работы тэатра імя Янкі Купалы можна ў добрай якасці запісу паглядзець анлайн — квіток на віртуальны паказ каштуе дзесяць рублёў.

«Шлюб з ветрам» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі

Прафесіяналы лічаць, калі б гэты спектакль з'явіўся ў нашай прасторы раней, беларускі тэатр развіваўся б зусім іншым шляхам. Адносна новая прэм'ера — яна адбылася летась у снежні, а з-за каранавіруса можна сказаць, усё роўна што ўчора — выклікала ў прафесіяналаў узрушэнне. Гэта гісторыя пра трохкутнік — маці, сын і яго каханая, супраць якой паўстае маці, а сын па сутнасці мусіць выбіраць паміж дзвюма жанчынамі. У фальклорным рэчышчы, з беларусацэнтрычным настроем, унікальны з пункту гледжання аўтарскіх знаходак, у тым ліку сцэнографа Таццяны Нерсісян. Яўген Карняг лічыцца адным з лідараў нашай тэатральнай сферы — толькі ў дзяржаўных тэатрах ён паставіў небезвядомыя «Інтэрв'ю з ведзьмамі» (мінскі Тэатр лялек), «Бетон» (зноў жа РТБД), «Сёстры Грайі» (маладзечанская «Батлейка»), што станавіліся падзеяй. На сутнасці, чакаць выхаду тэатра з каранціну варта было ўжо толькі дзеля «Шлюбу з ветрам».

«Маленькі востраў» Нацыянальнага тэатра ў Лондане

За кнігу «Маленькі востраў» Андрэа Леві ў свой час атрымала адну з самых прэстыжных англамоўных літаратурных прэмій Whitbread Book Award. У сваім творы брытанская пісьменніца паказвае уплыў Другой сусветнай вайны, праблему эміграцыі, каланіяльны кантэкст, сексізм і ксенафобію ў пасляваенным Лондане, дзе перасякаецца некалькі персанажаў з розным мінулым і паходжаннем. Раман быў нават экранізаваны — рэжысёрам стаў Джон Аляксандр, а акцёрамі выступілі Наомі Харыс, Рут Уілсан, Бенедзікт Камбэрбэтч ды іншыя. Цяпер увасабленне літаратурнай першакрыніцы можна ўбачыць у якасці тэатральнай пастаноўкі і не дзе-небудзь — за кнігу ўзяўся рэжысёр Руфус Норыс на сцэне лонданскага Нацыянальнага тэатра. У спектаклі можна назіраць, як тыя персанажы змагаюцца з няпростымі часамі і мараць пра лепшае з Другой сусветнай да 1948 года. Пастаноўка задзейнічае сорак акцёраў і на думку крытыкаў уяўляе сабой эпічны твор пра сярэдзіну мінулага стагоддзя. На сайце Нацыянальнага тэатра «Маленькі востраў» можна паглядзець да 25 чэрвеня.

«Самнамбула» ў Венскай оперы

Двухактовая опера Вінчэнца Беліні расказвае заліхвацкую гісторыю пра тое, як сялянская дзяўчына Аміна праз свой самнамбулізм аказваецца абвінавачанай наваспечаным мужам Эльвіна ў здрадзе, прычым у здрадзе з графам. Усё, вядома, канчаецца добра. Венская статсопера працягвае паказваць выдатнай якасці запісы сваіх пастановак анлайн — праграма распісаная на цэлы чэрвень, на кожны дзень прызначаны новы твор. На наступным тыдні такім чынам можна будзе паслухаць «Хаваншчыну» Мадэста Мусаргскага, сучасную работу «Арланда» Вольгі Нойвірт па матывах твораў Вірджыніі Вульф, «Смерць Дантона» Готфрыда фон Эйнэма, нарэшце 24 чэрвеня — італьянскую «Самнамбулу» з камедыйнымі перыпетыямі і клятвамі ў каханні да магілы. Для прагляду трэба быць зарэгістраваным на сайце Венскай оперы.

Шоу «новага цырка» ад кампаніі FLIP Fabrique

Гэта цэлая з'ява — так званы кантэмпарары цырк, які запрашае гледачоў не на клаўнаду і праезды на кані, а на паўнавартасныя, драматургічна вывераныя, насычаныя рознымі відамі мастацтва шоу. Да таго ж звычайна кампаніі, што робяць «новы цырк», не задзейнічаюць жывёл. З'ява атрымала мноства абліччаў, кірункаў і ўвасабленняў — інжынерны, індустрыяльны цырк, тэатр-цырк. Шмат у гэтай сферы і тых, хто робіць, па сутнасці, кампіляцыю з нумароў, бо кожны выступоўца спецыялізуецца на сваім уменні, і ўплятае ў відовішча дадатковыя віды мастацтва — танец, музыку, відэаарт, нарэшце, драматычны тэатр. Адной з кампаній, якая робіць такі цырк, і робіць яго паспяхова, дэманструючы свае дасягненні на прэстыжных цыркавых пляцоўках, з'яўляецца арганізаваная ў 2011 годзе ў канадскім Квэбеке каманда FLIP Fabrique. Праз каранавірус на сайце цырка выкладзена парачка створаных канадцамі шоу, і іх можна паглядзець бясплатна.

Падрыхтавала Вольга МІЦКЕВІЧ.

...Навошта табе мой тэлефон?..

Тэхніка катастрофы: сродак раскрыць чужыя і свае сакрэты

Ён глядзіць у тэлефон, імкнецца кантраляваць сітуацыю. Яна ўпэўненая, што яго турбуюць з работы. Яны шчаслівыя. Пакуль яна ўсё ж не выхапіла прыладу і не прачытала паведамленне. Ён імкнецца апраўдацца. Ці атрымаецца?

Зразумелая сітуацыя, фактычна, навокал можна назіраць, як людзі літаральна «сядзяць» у сваіх смартфонах, нават прытым, што побач знаходзіцца хтосьці з блізкіх. Але ў віртуальным свеце побач з табой адначасова могуць быць іншыя людзі, кантакт з якімі захапляе нават больш, чым з тым, каго даўно і добра ведаеш. Да чаго гэта можа прывесці, паказалі ўдзельнікі спектакля «ШкілеТЫ» Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра. Героі, якія даўно знаёмыя і сябруюць сем'ямі: Гана (актрыса Аляксандра Змітровіч) і Віктар (акцёр Дзяніс Маісейчык), Карына (Таццяна Новік) і Юрый (ролю выконваў Гарык Вепшкоўскі, які заўчасна пакінуў гэты свет), Ларыса (Вольга Роік) і Віктар (Андрэй Гладкі), Антон (Аляксандр Корнеў) і Глаша, яго новае каханне, якое ён павінен усім прадставіць. Сустрэча, задуманая для прыемных зносін і разняволення, абарочваецца выкрываннем патаемных бакоў жыцця кожнага з герояў. За весялосцю гісторыі паступова праступае яе рэальны твар, скрыўлены глыбокімі драмамі.

Гэта адна з чаканых прэм'ер сезона, разлічаная на актыўнага гледача, якога запрашаюць да прамой размовы і абмеркавання шэрагу пытанняў, што некага (а можа і ўсіх) павінны зачапіць. Для гэтага прыдатныя ўмовы: Малая зала, у якой іграюць артысты, дзе фактычна няма адлегласці ад сцэны. Пры гэтым самі ўдзельнікі спектакля спускаюцца ў залу і звяртаюцца да прысутных у спробах разабрацца ў сітуацыях. І публіка ідзе на кантакт, як паказала практыка першых паказаў. Гледачы гатовыя да таго, што тэатр можа існаваць у актыўнай форме: не проста ілюстраваць жыццёвыя праблемы і задаваць пытанні са сцэны, а прапаноўваць шукаць адказы разам праз абмеркаванне літаральна падчас паказу. Спектакль-інтэрактыў — вызначыў форму Аляксей Шутаў, які выступіў рэжысёрам-пастаноўшчыкам. І прапанаваў людзям не быць маўклівымі назіральнікамі, а разважаць разам з героямі. Аказалася, публіка гатовая да прамога кантакту і не саромеецца выказвацца па кожнай з прапанаваных тэм.

Тым больш што ў спектаклі «ШкілеТЫ» перад вачыма разгортваюцца чалавечыя драмы, і адсутнасць нябачнай сцяны, якая аддзяляе публіку ад сцэны, робіць кожнага датычным да чужых таямніц. А гэта інтрыгуе.

Як і сустрэча, на якую нас запрашаюць. У антыкафэ адбываецца выстаўка нейраграфікі (мастак-пастаноўшчык Вольга Калабан упрыгожыла сцэну сваімі работамі). Гэта мастацтва, якое імкнецца зазірнуць у глыбіні чалавечай падсвядомасці. Нездарма абраны такі фон: кожнаму з герояў, з якімі мы тут сустрэнемся, неабходна разабрацца ў сабе. І было б добра ім гэта зрабіць своечасова, не зацягваючы ўласныя праблемы і комплексы, зразумеем мы. І адначасова даведаемся пра мастацтва, здольнае стаць выкідам псіхічнай энергіі для кожнага. Гаспадар антыкафэ (акцёр Яўген Лук'янаў) яшчэ да пачатку спектакля распавядае каб практыцы нейраграфікі, прапануючы ўласнаручна дакрануцца да яе кожнаму, каго цікавяць таямнічыя «ШкілеТЫ». Ён прапануе героям быццам бы бяскрыўдную гульню з прачытаннем уголас паведамленняў, што прыходзяць на мабільны тэлефон.

Шкілеты ў шафе мае кожны з герояў, якіх Аляксей Шутаў запрасіў у спектакль, уласна стварыўшы драматургічны матэрыял паводле італьянскага фільма «Ідэальныя незнаёмцы». Вядома, калізіі фільма як глеба для тэатральнай пастаноўкі патрабавалі дапрацоўкі з пралічанай завязкай, кульмінацыяй і дакладна прадуманымі і прастаўленымі сюжэтнымі павароткамі, бо тэатр патрабуе веры. Аднак рухавіком спектакля, які для Шутава з'яўляецца дэбютам у рэжысуры, сталі не сюжэтныя калізіі, у якіх не стае тэатральнай дадуманасці, а менавіта інтэрактыўная форма, якой не можа прапанаваць фільм. У гэтым плюс тэатральнай работы, якая вылучаецца сярод прапаноў мінскіх рэпертуарных тэатраў неардынарнасцю. Пагадзіцеся, спектакль, які можа быць адначасова сеансам псіхатэрапіі, (паводле падыходу: «А ці не хацелі б вы пра гэта паразмаўляць?») — для нас навінка.

Пра што размаўляць, падказваюць сюжэтныя лініі і стасункі ў парах. Напрыклад, псіхолаг Ганна ўвесь час незадаволеная сабой і імкнецца падправіць сваю знешнасць. Але хавае гэта ад мужа, пластычнага хірурга. У яго свой погляд на прыгажосць. Ды наогул на ўсё — Віктар размаўляе па-беларуску і лічыць, што гэта натуральна і прыгожа. Давер да людзей і асабліва да блізкіх — таксама натуральна, як і адкрытыя стасункі бацькі з дачкой, якая не знаходзіць агульнай мовы з мамай. Ці не варта гэта ўсё абмеркаваць?

Не так проста ўсё ў сям'і Карыны і Юры: шмат гадоў сумеснага жыцця і жаданне кожнага з сужэнцаў пашукаць вострых пачуццяў дзесьці па-за шлюбам: тэлефоны па-здрадніцку выдаюць кампраметуючыя кантакты з віртуальнага свету — а сёння ён прыцягвае кожнага сваімі неабмежаванымі магчымасцямі, у тым ліку ў абуджэнні пачуццёвасці. Іншае пытанне: ці мацуе гэта сям'ю? Вось прыклад яркіх пачуццяў — Віктар і яго жонка Ларыса. Вочы гараць, абдымкі ды пацалункі не спыняюцца на зайздрасць сябрам. Шчасце... Яго можна не хаваць, калі іншыя гатовыя да твайго шчасця. З гэтым не пашчасціла Антону: насамрэч няма ніякай каханай Глашы, але Антон і не самотны. Ды для сяброў становіцца шокам яго выбар. Зразумець — значыць паспрабаваць улезці ў скуру сябра, што адбываецца з Юрам, у якога на твары застаецца крывавы след сяброўства ды шмат пытанняў. Ігра Гарыка Вепшкоўскага і асабліва яго натуральны выхад у інтэрактыў былі сапраўднай удачай спектакля, што накладвае дадатковую адказнасць на акцёра, які яго заменіць...

Пытанні пра шчасце — заўсёды самыя абстрактныя і адначасова вельмі канкрэтныя. Сваё шчасце мы як правіла звязваем з дарагімі людзьмі. Але ці значыць «даражыць» — «давяраць» цалкам і назаўсёды? Банальнае пытанне, здавалася б, з адназначна правільным адказам. Не ўсё так проста: небанальнае вырашэнне адкрывае прысутным магчымасць быць самімі сабой у тэатры, паглыбляючыся ў сцэнічную гісторыю, не забываць пра ўласнае «я». Пры ўсім тым, што акцёры імкнуцца выводзіць гледачоў на адкрыты дыялог, гісторыя ідзе да лагічнай кропкі са скразной думкай: ці можна кагосьці ашчаслівіць праз хлусню? Праўда бывае балючай, але яна дазваляе пазбегнуць незваротнай жыццёвай катастрофы, якую потым захаваце гісторыя паведамленняў у мабільнай прыладзе.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Першыя паказы гэтага спектакля, што адбыліся вясной, выклікалі небывалую цікавасць і аншлаг, прытым, што ў той час гледачы ўжо хадзілі ў тэатр з асцярогай з-за пандэміі. Пасля ў тэатра некаторы час быў вымушаны перапынак. Цяпер установа працуе, ідуць рэпетыцыі новых спектакляў. І ёсць спадзяванне, што выбіраючы білеты ў тэатр летам, гледачы не забудуць пра нядаўнія прэм'еры Маладзёжнага.

«Правялі клетачную тэрапію — і пацыент пачаў размаўляць і хадзіць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

1990-я ён згадвае як «ліхія» і ў медыцыне:

— Не закуплялася абсталяванне, не хапала медыкаментаў, былі вельмі нізкія зарплаты. Працаваць даводзілася на 2-2,5 стаўкі. Акрамя работы ў дзённы час, я браў пяць-шэсць дзяжурстваў па хірургіі, тры-чатыры па неўралогіі, акрамя таго, магло быць 15 дзяжурстваў па санітарнай авіяцыі. Начаваць дома даводзілася далёка не кожны дзень. Самае галоўнае — не было чым працаваць. Амаль адсутнічала абсталяванне, інструменты выходзілі са строю.

Выйсці з цяжкага становішча атрымалася толькі ў канцы 1990-х. Новае развіццё нейрахірургіі пачалося ў 2000-х. Сталічную 5-ю клініку наведаў кіраўнік дзяржавы, і пасля яго даручэнняў удалося закупіць новае абсталяванне. У прыватнасці, магнітна-рэзанансны тамограф — адзін з першых у краіне, — і аперацыйны мікраскоп.

— Памятаю, як з мяне жартавалі калегі, калі я сядзеў за гэтым мікраскопам. Бо аперацыю, якуюяны маглі скончыць у гадзіну-дзве, працуючы з бінакулярнай лупай, я завяршаў у тры-чатыры гадзіны. Пад мікраскопам большае разрозненне, відаць дробныя структуры — больш уважліва працуеш, ды і развіццё навыку патрабуе часу. Пазней, калі ў нас з'явіліся дадатковыя мікраскопы, у хірургаў узнікла жаданне з імі працаваць, такія аперацыі ўсімі былі асвоены, — згадвае Юрый Шанько.

Ён разам з калегамі развіваў адзін з найскладанейшых кірункаў — хірургію асновы чэрапа, якой была прысвечана яго дысертацыя.

— У 2003 годзе ў Мінску праходзіў з'езд анколагаў СНД, і ўпершыню там працавала секцыя па нейраанкалогіі — пухлінах цэнтральнай нервовай сістэмы. Былі запрошаны і прыехалі выдатныя нейрахірургі — акадэмік Канавалаў са сваімі калегамі з Масквы, прафесар Зельман з Лос-Анджэлеса. І масквічы з інстытута імя Бурдэнкі, а гэта адна з найлепшых нейрахірургічных устаноў свету, прадставілі матэрыял з 40 выпадкамі краніяфацыяльных рэзекцый, а мы прадставілі матэрыял з больш чым 20! Яны былі надзвычай уражаны, што ў нас развіваецца такі кірунак, — расказвае прафесар Шанько.

Ён тлумачыць, што краніяфацыяльная рэзекцыя — надзвычай складаная аперацыя. Пухліна, часцей за ўсё злаякасная, вырастае з асновы чэрапа адначасова як у яго поласць (у мозг), так і за межы поласці чэрапа — у структуры твару (арбіту вока, нос). Раней пры злаякасных пухлінах выдалялі тую частку, якая знаходзілася ў поласці чэрапа, астатняе апраменьвалі і рабілі хіміятэрапію. Пры гэтым працягласць жыцця была мінімальная, бо частка пухліны заставалася. Краніяфацыяльныя рэзекцыі дазваляюць і выдаліць пухліну з мозга з яго ўчасткам, і рэзецыраваць аснову чэрапа, а таксама тканкі арбіты разам з вокам. Пасля пацыенту робіцца пластыка, а яго працягласць жыцця павялічваецца ў некалькі разоў.

— Адным з найвялікшых адкрыццяў канца XX стагоддзя ў нейрахірургіі лічыцца так званая хірургія замочнай адтуліны, — працягвае Юрый Георгіевіч. — Гэта хірургія праз малыя доступы, напрыклад, праз доступ 2х2 сантыметры можна дабрацца да новаўтварэння памерам 5х7 см і выдаліць яго. Пры гэтым працягласць аперацыі скароціцца, аперацыйная траўма мозга зменшыцца і функцыянальны вынік палепшыцца. Шэсць гадоў мы развіваем гэты кірунак, і лятальныя зыходы пасля такіх аперацый у нас зведзены да абсалютнага мінімуму. А функцыянальныя вынікі сталі лепшыя, і скараціўся час аперацый.

Прычым для выканання гэтых умяшанняў беларускія нейрахірургі выкарыстоўваюць не аперацыйны мікраскоп, а аперацыйны эндаскоп — па прыкладзе амерыканскіх нейрахірургаў з клінікі Пенсільванскага ўніверсітэта. Гэта дазваляе яшчэ больш зменшыць памеры доступу і, адпаведна, аперацыйныя траўмы. Сёння на рахунку айчынных нейрахірургаў больш за 300 такіх умяшанняў, прычым з добрымі вынікамі. Асвойваць гэты кірунак да іх прыязджалі нават калегі з маскоўскага інстытута імя Бурдэнкі.

З расійскімі калегамі з інстытута імя Бурдэнкі.

«Акадэмік Смеяновіч дагэтуль аперыруе»

Сёння РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі мае самае сучаснае абсталяванне, у прыватнасці, найноўшыя аперацыйныя мікраскопы і эндаскопы, падрыхтаваных спецыялістаў, каля трох дзясяткаў з якіх у свой час прыйшлі працаваць сюды адразу пасля размеркавання. Сёння гэта высакакласныя нейрахірургі, якія атрымалі практыку ў тым ліку і ў замежных клініках. І самае галоўнае — у цэнтры адкрыты новыя кірункі, якіх няма ў іншых краінах Еўропы і СНД, і ёсць распрацоўкі, якія выклікаюць зайздрасць замежных калег.

Настаўнікамі маладых урачоў становяцца іх сталыя калегі, у прыватнасці, дагэтуль працягвае дзяліцца навыкамі акадэмік Арнольд Смеяновіч.

— Арнольд Фёдаравіч і мой настаўнік, — кажа Юрый Шанько. — Гэта выключны спецыяліст: нягледзячы на паважны ўзрост (акадэміку 82 гады. — «Зв».), ён кожны дзень прыходзіць на работу — у аперацыйную. І не проста аперыруе, а выконвае найскладанейшыя ўмяшанні — вельмі хутка, якасна, без ускладненняў і з выдатным вынікам. Ён стараецца сачыць і за сваім здароўем, і ў гэтым яму дапамагае адзін з нашых урачоў — Гумен Гарбанеджад. Ён, дарэчы, іранец, скончыў наш медуніверсітэт і застаўся тут працаваць. Авалодаў усімі нашымі метадамі, нават ездзіць з намі ў рэгіёны з лекцыямі аб прафілактыцы тромбаэмбалічных ускладненняў.

Пад кіраўніцтвам акадэміка Смеяновіча праводзяцца даследаванні як па складаных кірунках сучаснай нейрахірургіі, так і больш прыкладныя. З дапамогай аднаго з іх удалося ўстанавіць, што пры пэўных злаякасных пухлінах галаўнога мозга, якія растуць з нервовай тканкі, у працэс пухліннага росту ўмешваецца вірус простага герпесу і робіць яго больш злаякасным. У такім выпадку вынікі могуць быць вельмі неспрыяльныя, нават пры максімальна магчымым лячэнні.

— Ва ўсім свеце працягласць жыцця пацыента з гліябластомай, якая мае 4-ю ступень злаякаснасці, пры выкарыстанні ўсяго арсеналу — хірургіі, прамянёвай тэрапіі, хіміятэрапіі — складае пасля радыкальнага выдалення пухліны 12-14 месяцаў. Пасля частковага — значна менш. Але калі ўдавалася ўздзейнічаць на вірус простага герпесу дастаткова простымі прэпаратамі, то працягласць жыцця гэтых пацыентаў павялічвалася ў некаторых выпадках да чатырох-пяці гадоў, — тлумачыць Юрый Георгіевіч. — Адна з вучаніц Арнольда Фёдаравіча Ганна Барысейка вельмі шырока прадстаўляе гэты матэрыял на міжнародных канферэнцыях, ён заўсёды выклікае захапленне. І мы збіраемся працягваць гэта даследаванне.

Развіваецца ў цэнтры і кірунак эндаваскулярнай хірургіі — без адкрытых умяшанняў, калі пранікненне адбываецца спецыяльным інструментам праз сасуд. Гэта выключэнне артэрыяльных анеўрызмаў, артэрыявянозных мальфармацый, сасудзістай сеткі пухліны, каб аперацыя працякала менш траўматычна. Развіваецца стэрэатаксічная і функцыянальная нейрахірургія, шырока выкарыстоўваецца тэхналогія імплантацыі нейрастымулятараў — іх атрымліваюць усе пацыенты ў краіне, якія маюць у гэтым патрэбу.

Паказчыкі выжывальнасці з ЧМТ — адны з лепшых у свеце

Асаблівую ўвагу ў свой час давялося звярнуць на праблему чэрапна-мазгавых траўмаў.

— Калі ў сусветнай практыцы развівалі ся новыя тэхналогіі лячэння ЧМТ, у нас гэта было ў дастаткова запушчаным стане. Міністэрства аховы здароўя звярнула ўвагу на тое, што вынікі неспрыяльныя. Пад кіраўніцтвам Арнольда Смеяновіча быў створаны курс, і мы пачалі вучыць урачоў аперыраваць ЧМТ. Нам давялося развівацца, ездзіць і глядзець, як гэта робіцца ў іншых клініках, запрашаць да сябе спецыялістаў з інстытутаў Бурдэнкі і Скліфасоўскага. З'явіўся наш першы клінічны пратакол, і адбылося неверагоднае. Адсачыўшы статыстыку з 2010 года, мы ўбачылі, што спачатку ў нас было каля 30 выпадкаў смерці на 100 тысяч насельніцтва ў год, і паступова гэты паказчык зніжаўся — да 20, 15 і, нарэшце, да 10. Цяпер ён складае менш за 10 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва ў год. Гэта на ўзроўні найлепшых паказчыкаў у свеце — Германіі, Швецыі, Нарвегіі. Пры тым, што ў ЗША ён 20, ва Украіне — 25—30, сярэдні па Еўропе — 25, у некаторых рэгіёнах Расіі дасягае 40 і 50, — дзеліцца суразмоўца.

Сёння ў Беларусі арганізаваны міжраённыя цэнтры, адлегласць да якіх з любога населенага пункта складае не больш за 70 кіламетраў, што дазваляе даставіць туды пацыента з інсультам, ЧМТ цягам гадзіны. У такіх клініках ёсць камп'ютарныя тамографы, рэанімацыйныя ложкі і спецыялісты, якія акажуць кваліфікаваную спецыялізаваную дапамогу. У Мінску гэта Бальніца хуткай медыцынскай дапамогі і 5-я клінічная бальніца. Спецыялісты РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі падключаюцца на розных этапах і выязджаюць у любую клініку краіны для аперацыі ці кансультацыі: у прыватнасці, і для выканання эндаваскулярных умяшанняў.

— Гэта складаная галіна, якая патрабуе доўгай падрыхтоўкі спецыяліста: за год-два яго не навучыш. І калі ён будзе выконваць толькі 25-50 эндаваскулярных умяшанняў у год, то спецыялістам не стане. Бо трэба рабіць некалькі соцень такіх аперацый штогод, каб авалодаць навыкамі і адчуваць, як будзе паводзіць сябе анеўрызма, якую ты збіраешся выключыць. Таму прасцей накіраваць у рэгіён спецыяліста з неабходным расходным матэрыялам. А потым, калі хворы выйдзе з цяжкага стану, забраць яго ў Мінск і далей праводзіць лячэнне, — аргументуе Юрый Шанько.

Па што едуць у Беларусь замежнікі?

Замежныя пацыенты на аперацыйным стале беларускіх нейрахірургаў — таксама не рэдкасць. Прафесар Шанько расказвае паказальны выпадак.

— Малады амерыканец закахаўся ва ўкраінскую дзяўчыну, якая пераехала ў ЗША. Сабраўся з ёй ажаніцца. Але ў яго быў невялікі дэфект — дабраякасная пухліна ніжняй сківіцы. Перад вяселлем ён вырашыў ад недахопу пазбавіцца. У адной з клінік Маямі яму зрабілі аперацыю: выдалілі пухліну, паставілі металічную канструкцыю, якая трымала сківіцу. Даследаванне пухліны паказала, што яна дабраякасная і цалкам выдалена. Можна праводзіць наступны этап хірургічнага лячэння — аперацыю коснай пластыкі. Зрабілі і гэта: узялі частку яго падуздышнай косткі, каб запоўніць дэфект ніжняй сківіцы. Пры гэтым аперацыю рабілі падыходам знутры сківіцы, і так атрымалася, што дастаткова доўга была пераціснута ўнутраная сонная артэрыя. Малады чалавек атрымаў інфаркт мозга з развіццём паралічу правых канечнасцяў, поўнай стратай маўлення, прычым інфаркт мозга быў прагрэсуючы. Для таго каб выратаваць мозг, у такіх выпадках выконваецца дэкампрэсійная краніятамія. Яму выдалілі частку косці чэрапа памерам 12х15 см, а калі мозг справіўся з ацёкам, устанавілі тытанавую пласціну. Але параліч і парушэнне маўлення засталіся. Пацыенту правялі максімальна магчымае лячэнне, нават клетачную тэрапію. Ствалавыя клеткі ўводзілі ўнутрывенна. Гэта дапамагло: ён стаў вымаўляць асобныя словы, мог прайсці тры-пяць крокаў уздоўж ложка — і не больш.

Дарэчы, такое лячэнне абышлося ў ЗША ў 500 тысяч долараў. Але вынік быў нездавальняючы. Маладога чалавека яго нявеста прывезла на лячэнне ў Беларусь.

— У нас на той момант ужо знайшла сваё развіццё практыка лячэння ачаговых паражэнняў галаўнога мозга з дапамогай ствалавых клетак, але не так, як гэта традыцыйна робіцца ў свеце, — працягвае Юрый Шанько. — Важна не проста ўвесці ствалавыя клеткі, а даставіць іх у галаўны мозг. Калі іх уводзяць праз вену, усяго 0,2 % клетак трапляе ў галаўны мозг, калі праз артэрыю — 2 %. Калі іх уводзіць у спіннамазгавы канал, яны ўвогуле ў мозг не трапяць. Калі непасрэдна ў галаўны мозг з дапамогай стэрыятаксічных прыстасаванняў, то ў месцы ўвядзення ўзнікае ачаг траўмы, і большая частка гэтых клетак спрацуе, каб яго ліквідаваць. Здавалася б, бязвыхадная сітуацыя. Наш інстытут фізіялогіі НАН займаецца гэтай тэмай на чале з акадэмікам Уладзімірам Кульчыцкім шмат гадоў. Існуе дакладная канцэпцыя: ствалавая клетка перамяшчаецца перынеўральна — уздоўж нервовых валокнаў у напрамку руху нервовага імпульсу. Прычым уздоўж не рухальных, а адчувальных нервовых валокнаў. Такім чынам ствалавыя клеткі ў вялікай колькасці трапляюць у галаўны мозг. Ведаючы эксперыментальную падаплёку гэтага метаду, мы адпрацавалі яго ў клініцы, апрабавалі на пацыентах з інфарктамі мозга, унутрымазгавым крывазліццём, якое суправаджаецца другаснымі інфарктамі мозга, цяпер ідзе апрабацыя пры цяжкай чэрапна-мазгавой траўме. І амаль ва ўсіх выпадках такое лячэнне дэманструе выдатны эфект.

Амерыканскаму пацыенту таксама правялі клетачную тэрапію, і ён цягам месяца пачаў размаўляць фразамі, хоць пакуль і невялікімі, і мог самастойна прайсці да 100 метраў. Эфекту ўдалося дасягнуць усяго за адзін курс клетачнай тэрапіі, які абышоўся ў 10 тысяч долараў.

— Калі я спытаў яго блізкіх, ці варта было ехаць у Беларусь, адказ быў адназначны: безумоўна, — дзеліцца суразмоўца. — Зараз да нас на лячэнне едуць грамадзяне нашых бліжэйшых суседніх краін, і мы плануем заключаць дамовы на сумесныя даследаванні, у першую чаргу з расіянамі. У большасці краін СНД лячэнне ствалавымі клеткамі закрытае. Але гэта вельмі перспектыўны, хоць і складаны кірунак, які патрабуе спецыфічнага абсталявання, навыкаў і лабараторый.

Алена КРАВЕЦ.
Фота з асабістага архіва Юрыя ШАНЬКО.

Дзякуй за працу!

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава напярэдадні Дня медыцынскіх работнікаў наведала Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі.

РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі — унікальная структура аховы здароўя. Аб'ёмы аказання спецыялізаванай медыцынскай дапамогі ў цэнтры пастаянна павялічваюцца. Расце аб'ём экспарту медыцынскіх паслуг. 1 чэрвеня 2019 года ў цэнтры адкрылася лабараторыя генетычных біятэхналогій, што дасць магчымасць не толькі выйсці на новы ўзровень дыягностыкі, але і індывідуалізаваць супрацьпухлінную тэрапію і зрабіць яе больш кропкавай.

— Хацела б падзякаваць за вашу працу — такую нялёгкую, няпростую. Лячыць чалавека заўсёды цяжка, а дзіця — у сто разоў цяжэй. Няхай вам спадарожнічае ўдача, няхай прафесійны рост працягваецца. Мы ганарымся вашым цэнтрам, вашай работай і вельмі ўдзячныя вам, — звярнулася да медыкаў спікер верхняй палаты парламента.

Многія асабліва ацанілі работу медработнікаў зараз, у гэты складаны год, дадала яна. «Я курырую работу медыкаў у барацьбе з пандэміяй. І, па-мойму, у свеце мы найлепшыя», — лічыць кіраўнік Савета Рэспублікі.

Таксама Наталля Качанава ўручыла цэнтру сертыфікат на набыццё сістэмных блокаў, а найлепшым супрацоўнікам — падзякі.

Па словах дырэктара цэнтра Наталлі Канаплі, за апошнія дзесяць гадоў у лячэнні анкалагічных і гематалагічных захворванняў тут дасягнуты значныя поспехі.

— Выжывальнасць дзяцей сёння складае каля 80 %, што адпавядае вядучым еўрапейскім клінікам. Прычым у лячэнні шэрагу паталогій дасягнуты паказчык 90 %, а некаторыя віды раку цалкам вылечныя, — сцвярджае яна.

Дарэчы, тэрыторыю цэнтра нядаўна добраўпарадкавалі: ландшафтныя кампазіцыі ўпрыгожылі ўнутраны дворык. Аўтарам работы стала магістрантка БДТУ, памочнікам выступіў Савет Рэспублікі.

Паводле БелТА.

Прыемная навіна

Новыя аўтамабілі — у падарунак

Ключы ад 80 новых аўтамабіляў уручыў медыкам цэнтральнага рэгіёна старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН на пляцоўцы БелДжы пад Барысавам, у тым ліку ад 19 легкавушак і 5 перасоўных медыцынскіх комплексаў.

Фота БелТА.

У Барысаўскі раён адправяцца сем аўто, тры з якіх прызначаны для Барысаўскай цэнтральнай раённай бальніцы, тры — для бальніцы № 2 і адна для радзільнага дома. Дзве новыя легкавушкі Geely і перасоўны комплекс атрымала Клецкая бальніца. Цяпер мясцовыя медыкі змогуць камфортна і больш эфектыўна абследаваць жыхароў сельскіх населеных пунктаў і наблізіць аказанне медыцынскіх паслуг да ўзроўню гарадскога насельніцтва.

Мінскаму абласному цэнтру хуткай медыцынскай дапамогі дасталіся чатыры «хуткія». Маладзечанскай ЦРБ уручаны ключы ад трох машын хуткай дапамогі і трох машын медыцынскай дапамогі. Словам, без падарункаў напярэдадні прафесійнага свята не засталіся медыкі ніводнага раёна.

Гэта значная дапамога, асабліва цяпер, падчас пандэміі каранавіруса, калі на поўную моц працуюць як урачы, так і транспарт. Тым больш што рэанімабілі аснашчаны сучасным абсталяваннем, што дазваляе брыгадам медыкаў аказваць неадкладную дапамогу пацыентам па дарозе ў бальніцу. Як адзначалі прысутныя, у Мінскай вобласці ўдзяляюць значную ўвагу сферы аховы здароўя, мадэрнізацыі медыцынскіх аб'ектаў, будаўніцтву новых, аснашчэнню іх сучасным абсталяваннем. Па словах Аляксандра Турчына, толькі ў Мінскім раёне запланавана восем аб'ектаў. Два з іх ужо ўведзены ў дзеянне — тэрапеўтычны корпус і Хацежынская ўрачэбная амбулаторыя. У Барысаве ўзводзяцца дзіцячы шматпрофільны корпус, станцыя пераліванне крыві і хірургічны корпус. Сёлета для ўкамплектавання медыцынскіх установ найноўшым абсталяваннем з абласнога інавацыйнага фонду накіравана больш за 20 мільёнаў рублёў. Налета плануецца пачаць праект, які дазволіць стварыць як мінімум па адным аддзяленні ў кожным раёне, дзе кожны пацыент зможа атрымаць высокатэхналагічную медыцынскую дапамогу. Акрамя таго, як адзначыў Аляксандр Турчын, прынята рашэнне набыць 20 аўтамабіляў Geely для санітарна-эпідэміялагічнай службы. На гэта выдзелена больш за 500 тысяч рублёў з рэзервовага фонду.

Падчас урачыстай цырымоніі Аляксандр Турчын уручыў медыкам ганаровыя граматы Мінаблвыканкама — а ў цэлым іх атрымаюць 500 чалавек. А таксама падзякаваў за цяжкую напружаную работу, якую можна сёння параўнаць з перадавой. «Менавіта вы, нягледзячы на небяспеку, першыя зрабілі крок у невядомасць, а сёння перамагаеце гэтую хваробу. Ваш шчыры клопат усё жыццё будуць помніць тысячы пацыентаў», — падкрэсліў губернатар.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

УВАГА! ПАСТУПАЕМ У АСПІРАНТУРУ І ДАКТАРАНТУРУ

Учреждение образования «Полоцкий государственный университет»

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ

за счет средств республиканского бюджета на 2020 год по следующим специальностям:

Специальность	Шифр	Количество мест: дневная	заочная	соискательство
Технология и оборудование механической и физико-технической обработки	05.02.07	1	-	-
Математическое моделирование, численные методы и комплексы программ	05.13.18	1	-	-
Химическая технология топлива и высокоэнергетических веществ	05.17.07	1	1	-
Эксплуатация автомобильного транспорта	05.22.10	1	-	-
Экономика и управление народным хозяйством (по отраслям и сферам деятельности)	08.00.05	2	-	-
Строительство и эксплуатация нефтегазопроводов, баз и хранилищ	25.02.07	-	-	1
ИТОГО:		**6**	**1**	**1**

ПРИЕМ ДОКУМЕНТОВ для поступления в аспирантуру осуществляется **с 1 августа по 30 сентября 2020 года**

Телефон для справок: **8 (0214) 59-95-64**

УНП 300220696

Учреждение образования
«МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЛИНГВИСТИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»
объявляет прием лиц для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета в соответствии с контрольными цифрами приема на 2020 год

АСПИРАНТУРА					ДОКТОРАНТУРА			
Шифр специальности	Наименование специальности	Количество мест: Дневная форма обучения	Заочная форма	Обучение в форме соиска-тельства	Шифр специальности	Наименование специальности	Количество мест: Дневная форма обучения	Обучение в форме соиска-тельства
10.01.03	Литература народов стран зарубежья	2	0	0	10.02.19	Теория языка	3	0
10.02.04	Германские языки	1	0	0	10.02.20	Сравнительно-историческое, типологическое и сопоставительное языкознание	3	1
10.02.19	Теория языка	3	0	0				
10.02.20	Сравнительно-историческое, типологическое и сопоставительное языкознание	9	0	2				
13.00.02	Теория и методика обучения и воспитания (иностранные языки)	2	0	0				
Всего:		**17**	**0**	**2**	**Всего:**		**6**	**1**

Лица, поступающие в аспирантуру, должны иметь:
• высшее образование;
• склонность к научным исследованиям, что подтверждается научными публикациями, участием в научно-исследовательских и инновационных проектах, конференциях или другими материалами;
• рекомендацию ученого совета (совета) учреждения высшего образования или факультета этого учреждения (для поступающих в год окончания обучения в данном учреждении) либо опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования.

Поступающие в аспирантуру для получения научной квалификации «Исследователь» в дневной или заочной форме получения образования должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления в аспирантуру.

Для поступающих в аспирантуру для обучения в заочной форме получения образования и в форме соискательства, за исключением обучения в форме соискательства в целях сдачи кандидатских экзаменов и зачетов по общеобразовательным дисциплинам, опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования, является обязательным.

Лица, поступающие в аспирантуру для обучения в дневной или заочной форме получения образования, сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме учебной программы I ступени высшего образования.

Лица, не прошедшие по конкурсу на обучение за счет средств республиканского бюджета, получившие на вступительном экзамене оценку не ниже «четыре», имеют право участвовать в конкурсе на обучение в аспирантуре на платной основе.

В докторантуру принимаются лица с ученой степенью кандидата наук, имеющие научные труды (статьи, монографии, изобретения, патенты и другие материалы, подтверждающие вклад в науку), составляющие в совокупности основу для докторской диссертации с возможностью ее завершения в течение трех лет.

Для поступления в докторантуру необходимо выступить с научным докладом на заседании кафедры университета по профилю своего исследования, а также представить проект индивидуального плана работы и обоснование сроков выполнения докторской диссертации. Кафедра университета анализирует актуальность научной темы, ее включение в утвержденные научные планы, соответствие приоритетным направлениям фундаментальных и прикладных научных исследований либо приоритетным направлениям научно-технической деятельности, материально-техническое и финансовое обеспечение диссертационного исследования, а также другие условия, обеспечивающие подготовку докторской диссертации в установленные сроки

Срок обучения в аспирантуре в дневной форме – 3 года, в заочной – 4 года, в форме соискательства – 5 лет.

Срок обучения в докторантуре в дневной форме – 3 года, в форме соискательства – 5 лет.

Прием документов – **с 1 по 30 сентября 2020 года.**
Вступительные испытания проводятся **с 12 по 16 октября 2020 года.**
Начало обучения – **1 ноября 2020 года.**

Адрес: **220034, Минск, ул. Захарова, 21, корп. Б, ауд. 315.**
Телефон для справок: **2844748.**
e-mail: **g.course@mslu.by** Web-сайт: **www.mslu.by**

УНП 100028902

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский радиозавод» (продавец) извещает о проведении 8 июля 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Местонахождение лотов: г. Гомель, ул. Объездная, 9			
1	**Пневматический пресс HB5222Б-01 (инв. №686),** г. в. 1973	**2 100,00**	210,00
2	**Станок вертикально-сверлильный 2Н135 (инв. № 989),** г. в. 1975	**1 040,00**	104,00
3	**Пресс гидравлический PYE25S1 (инв. № 1117),** г. в. 1976	**2 400,00**	240,00

Продавец: ОАО «Гомельский радиозавод», г. Гомель, ул. Объездная, 9. Порядок **ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 544-38-37 – Титков Виктор Семенович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 июня 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 6 июля 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов обязаны: подписать протокол о результатах аукциона, произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 17.04.2020 г. № 75 (29189), от 06.05.2020 г. № 86 (29200). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Крупский плодоовощной завод» (УНП 600025392) в лице ликвидатора ООО «Партнер-Консультант»,** тел. +375 (17) 395-58-91.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **30 июня 2020 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС	Шаг торгов (5 %), бел. руб.	Сумма задатка (10 %), бел. руб.
1	Емкость 15 м³, инв. № 4290754 (б/у)	324,00	16,20	32,40
2	Емкость 15 м³, инв. № 4290755 (б/у)	324,00	16,20	32,40
3	Емкость 15 м³, инв. № 4290756 (б/у)	324,00	16,20	32,40
4	Емкость 15 м³, инв. № 4290757 (б/у)	324,00	16,20	32,40
5	Емкость 15 м³, инв. № 450107 (б/у)	324,00	16,20	32,40
6	Емкость 16 м³, инв. № 4290781 (б/у)	324,00	16,20	32,40
7	Емкость 16 м³, инв. № 4290782 (б/у)	324,00	16,20	32,40
8	Емкость 20 м³, инв. № 4290759 (б/у)	360,00	18,00	36,00
9	Емкость 20 м³, инв. № 4290760 (б/у)	360,00	18,00	36,00
10	Емкость 16 м³, инв. № 4290762 (б/у)	324,00	16,20	32,40
11	Емкость 16 м³, инв. № 4290763 (б/у)	324,00	16,20	32,40
12	Емкость 16 м³, инв. № 4290764 (б/у)	324,00	16,20	32,40
13	Емкость 16 м³, инв. № 4290765 (б/у)	324,00	16,20	32,40
14	Емкость 16 м³, инв. № 4290768 (б/у)	324,00	16,20	32,40
15	Емкость 16 м³, инв. № 4290769 (б/у)	324,00	16,20	32,40
16	Емкость 16 м³, инв. № 4290770 (б/у)	324,00	16,20	32,40
17	Автомат для укупорки Л5-ВУВ, инв. № 450124 (б/у, н/раб)	306,00	15,30	30,60
18	Этикетировочный автомат Л5-ВЭ2М, инв. № 450064 (б/у, н/раб)	414,00	20,70	41,40
19	Вибробункер Л5-ВБК, инв. № 450074 (б/у, н/раб)	52,20	2,61	5,22
20	Устройство для переворачивания В6-ВИА, инв. № 450125 (б/у, н/раб)	99,00	4,95	9,90
21	Машина фасовочная Д9-ВРЕ6, инв. № 450076 (б/у, н/раб)	684,00	34,20	68,40
22	Автомат наклеивания марок АНМК-4, инв. № 450065 (б/у, н/раб)	252,00	12,60	25,20
23	Водонагреватель, инв. № 450113 (б/у, н/раб)	28,80	1,44	2,88
24	Комплект транспортеров Б-2 (б/у, н/раб)	583,20	29,16	58,32
25	Разливочный аппарат (б/у, н/раб)	306,00	15,30	30,60
26	Котел паровой Е-1,0-0,9Р-3 (Э), инв. № 430116 (б/у, н/раб)	1 638,00	81,90	163,80

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС	Шаг торгов (5 %), бел. руб.	Сумма задатка (10 %), бел. руб.
1	Емкость 15 м³, инв. № 450108 (б/у)	648,00	32,40	64,80
№ лота	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС	Шаг торгов (5 %), бел. руб.	Сумма задатка (10 %), бел. руб.
1	Емкость 20 м³, инв. № 4290758 (б/у)	600,00	30,00	60,00
2	Емкость 50 м³, инв. № 4290752 (б/у)	1 440,00	72,00	144,00
№ лота	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС	Шаг торгов (5 %), бел. руб.	Сумма задатка (10 %), бел. руб.
1	Емкость 25 м³, инв. № 4290783 (б/у)	1 560,00	78,00	156,00

Местонахождение – г. Крупки, тел. для ознакомления +375292756059.

